ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Год выдання 35-ы
№ 59 (2112)
22 ліпеня 1966 г. ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

Браты не пакідаюць адзін аднаго ў бядзе—на тое яны і браты. Такімі словамі сустракалі ў Ташкенце першы эшалон з будаўнічымі матэрыяламі з Беларусі. Першы эшалон... Здаецца, гэта было зусім нядаўна. А сёння ў горад, які пацярпеў ад землетрасення, ужо адпраўлены з нашай рэспублікі сотні вагонаў з будаўнічымі механізмамі, аўтамашынамі, інструментам, лесам, рэйкамі, арматурнай сталлю, абуткам, тканінай і г. д.

Новы мікрараён Чыланзар—так будзе называцца жылы масіў з пяці-, дзевяці- і дзесяціпавярховых дамоў, які ўзводзяць цяпер у Ташкенце беларускія будаўнікі разам з будаўнікамі прыбалтыйскіх рэспублік, Грузіі, Азербайджана і Казахстана.

У дамах, якія ставяць нашы будаўнікі, сейсмастойкасць павышана да дзевяці балаў. Фасады дамоў будуць абліцоўвацца сямішчылінная цэглай, якую выпускае Гарынскі завод Брэсцкай вобласці, а таксама каляровай керамічнай пліткай, што вырабляе Мінскі камбінат будаўнічых матэрыялаў.

Вялікую дапамогу ў забудове Ташкента аказваюць беларускія архітэктары і праекціроўшчыкі. Частка іх выехала ў сталіцу Узбекістана. Разам са сваімі калегамі з іншых рэспублік яны распрацавалі зыходныя даныя для дэталёвага праектавання Чыланзара.

У Мінску тым часам праекціроўшчыкі распрацоўваюць праекты забудовы новага ташкенцкага мікрараёна.

За гэтай работай карэспандэнт БЕЛТА Ул. Лупейка сфатаграфаваў групу работнікаў «Белдзяржпраекта»: старшага тэхніка Л. МІЛОВУ (злева), галоўнага архітэктара праекта А. ЛАДЫГІНУ, старшага інжынера Б. КАДУШЫНА і інжынера Р. ДАНЧЫКА.

У НЯДЗЕЛЮ ДЗЕНЬ РАБОТНІКА ГАНДЛЮ

Вы зайшлі ў магазін. Вам трэба купіць тую ці іншую рэч. І ў гэты момант вашым дарадчыкам, вашым шчырым субяседнікам, сябрам стаў прадавец. Колькі іх, людзей сціплай, ганаровай прафесіі! Многія з іх узнагароджаны ордэнамі, медалямі.

Значныя поспехі дасягнуты работнікамі гандлю нашай рэспубліцы.

Новую кнігу вы таксама купляеце ў магазіне. І тут ваш дарадчык — прадавец. Пазнаёмцеся з адным з іх — Ларысай Алабінай, прадаўшчыцай кніжнага магазіна № 11 г. Мінска. Два гады таму назад дзяўчына скончыла дзесяцігодку. Абрала сабе прафесію прадаўшчыцы кніжнага магазіна. Аматары кніг, зайдзіце, калі ласка, у магазін, дзе працуе Ларыса, і вы вернецеся дамоў абавязкова з цікавай кнігай.

Фота Ул. КРУКА.

СЁННЯ НАРОДНАЯ ПОЛЬШЧА СВЯТКУЕ 22 ГАДАВІНУ АДРАДЖЭННЯ І САВЁ ТЫСЯЧАГОДДЗЕ

ЯШЧЭ АДНО СЛОВА ПРЫЗНАННЯ

Янка БРЫЛЬ.

...Адразу, толькі пачуўшы па тэлефоне просьбу рэдакцыі, падумалася: ну што я магу новага сказаць пасля ўсіх сваіх выступленняў на гэтую тэму? Колькі ж разоў публічна прызнавацца ў пачуццях да польскага народа, да яго літаратуры, да тых яе прадстаўнікоў, з якімі я знаёмы ці сябрую?.. Тысячагоддзе Польшчы, дваццаць другая гадавіна яе новай, сацыялістычнай дзяржаўнасці — даты, бясспрэчна, вялікія, слаўныя, але ж і паўтарацца ў выступленнях нягожа...

Выхад мне падказалі не столькі, можа, адчуванне сяброўскага абавязку, колькі будзённыя факты сапраўднасці.

Пачну з апошняга.

Учора я з цікавасцю гартаў кнігу Ганны Мільскай «Польскія пісьменнікі. Выбраныя сілуэты», набытую ў нашай кнігарні «Дружба». Было прыемна, што з сотні гэтых сілуэтаў, ад пачынальніка польскай літаратуры, сярэдневяковага Мікалая Рэя да папулярнага сучаснага фантаста Станіслава Лема, большасць я ў той ці іншай ступені ведаю. Справа не ў акадэмічнай грунтоўнасці ведання, на якую ў такой вялікай літаратуры цяжка прэтэндаваць. Важна і радасна другое, — я ўжо даўно і шчыра люблю ў польскай літаратуры тое, што называецца вечным, агульналюдскім, значыцца, і нашым, беларускім, і маім.

Многае стала маім на парозе сталасці, калі настаўніца-полька, якой я, дарэчы, аддаў трохі сэрца ў «Сірочым хлебе» і ў «Птушках і гнёздах», выдавала нам, беларускім падлеткам, па порцыі ў дзень цудоўнага. Як маці, з беражлівай шчодрасцю. З той скарбніцы, веліч якое я адчуваў ужо тады з салодкім, сцішнаватым захапленнем, сам заглядаючы ў яе бяздонныя сховы.

Па-рознаму ўспыхвалі для мяне агеньчыкі блізкасці на старонках кнігі Г. Мільскай.

Адны пачуцці для Міцкевіча... Днямі паеду ў родныя мясціны, дзе мы разам з Уладзімірам Калеснікам будзем рабіць нарыхтоўкі для фотаальбома «Між тых палёў» (Міцкевічава Навагрудчына). Яшчэ адна пасільная, сціплая даніна яго веліччы.

Другое ўспамінаецца, калі чытаеш пра Ю. Кажанёўскага. Нашы заходнебеларускія самадзейныя спектаклі, калі ў зімовай цясноце вясковай школы або ў летняй прахалодзе гумна, з падмосткаў прымітыўнай сцэны словы гэтага, суха кажучы, прагрэсіўнага драматурга, гучала побач са словам Купалы, у яго несмяротнай, народнай «Паўлінцы».

Пра вечнае, агульналюдское добра думаць, правяраючы гэтай меркай сілу і вартасць сучаснага.

Мужна стрыманы боль, некрыклівую сілу, глыбокую думку апошніх вершаў Бранеўскага мне добра адчуваць, успамінаючы сустрэчы з гэтым абаяльным чалавекам. Знаёмства наша не паспела развіцца ў сапраўдную дружбу, хоць мы і пілі, па яго прапанове, на брудэршафт, пасля якога я зноў жа, не сарамліва, не ўпарта, а натуральна гаварыў яму «вы», прыняўшы ягонае «ты» як бацькоўскае. Аднак жа вершы яго здаюцца мне ад нашай блізкасці яшчэ раднейшымі і прыгажэйшымі. Дзіўнае спалучэнне пачуццяў — агульная для вельмі многіх павага да мастацкіх вартасцей, што цвёрда сталі ў строй вялікага і вечнага, і ціхая гордасць, што стваральніка гэтых вартасцей ты ведаў, што ты з ім не аднойчы гаварыў, дзяліўся хлебам і шчырасцю, што ў тваёй бібліятэцы ёсць кнігі з яго сяброўскім аўтографам.

А то і пісьмы ёсць, якімі ён зрэдку падмацоўваў цяпельца высокай, бо міжнароднай, і про…
ста чалавечай дружбы. Ту…
мне ўспамінаецца Леан К…
скі, з якім я, нягледзячы …
кую розніцу ў гадах, бы…
такі на «ты», густую проз…
я не толькі ахвотна чытаў…
перакладаў, з рабочай а…
адчуваючы месцамі, як …
лёгка.

Зноў іншыя, хоць тыя с…
сутнасці, пачуцці — да …
гвардыі сучаснай польска…
ратуры.

Тадэвуш Бароўскі. Мі…
з працецкай усмешкай. …
фашызмам і вязень трох…
гераў. Кніга ягоных апа…
«Развітанне з Марыяй», …
сілы мастацкае сведчан…
жахі Асвенціма, дала м…
да болю высокага хваляв…

Славамір Мрожак. Лет…
тападзе мы з Танкам за…
ў варшаўскім тэатры «…
філасофскімі мініяцюрам…
арыгінальнага, маладога…
лёка ўжо вядомага др…
сатырыка, слова якога, …
пакуль што чамусьці не…
на нашай беларускай с…

Болем адгукнуліся …
сэрцы страты польскай …
ры, панесеныя гэтым …
смерць Станіслава Ежы …
светнай вядомасці аўтара…
часаных думак», і см…
Бжэхвы, вясёлага, мудр…
дзея мастацкага слова д…
цей.

Не ўсе, каго я ведаю …
трапілі ў кнігу «Польскія …
нікі». Зрэшты, аўтар і …
тэндаваў на энцыклап…
ўсеабдымнасць, і цяжка …
яго прэтэнзію. Мне прос…
ніліся два харошыя тав…
добрыя літаратары, сус…
якімі і кнігі якіх у нейк…
ні сталі нядаўна фактам…
жыцця.

Леслаў Бартэльскі ап…
пазалетась у нашым …

бліскучы артыкул пра польскую пасляваенную літаратуру. Ён быў госцем рэдакцыі, потым мы з Танкам гасцілі ў ягонай сям'і, ездзілі з ім па начных вуліцах адроджанай прыгажуні-Варшавы. Удзельнік варшаўскага паўстання, ён праўдзіва расказаў пра трагічны гераізм тых дзён у адной са сваіх апошніх кніг, нядаўна прачытанай мною з вялікай цікавасцю.

Кніга Ежы Енджэевіча пра Тараса Шаўчэнку, якую ён прыслаў мне гэтай вясной, забрала тры мае рабочыя раніцы. Ды я чытаў яе з такім адчуваннем, якое бывае, калі паспяхова працуецца. Ці ж гэта не высокая …
Каму з нас не хацелася …
саць такую рэч, што …
чытача на некалі…
пра яго ўласныя …
Е. Енджэевіча …
або радасл…
проста вы…
аповед…
бо…

БУДНІ КІНЕМАТАГРАФІСТАЎ

ЗДЫМАЮЦЬ ДАКУМЕНТАЛІСТЫ

«Рэчыцкая лірычная...» Песня пра цудоўны горад над кручамі Дняпра. Яна стала цяпер славутай. А неўзабаве пра Рэчыцу раскажа і дакументальны каляровы фільм «Маленькі гарадок», які здымаюць рэжысёр С. Браўдэ і аператар Г. Карлаў. Сцэнарый напісаў Э. Карпачоў.

І яшчэ фільм — пра горад Брэст. Дакладней, пра яго бессмяротную цытадэль. Так і называецца ён, проста, лаканічна — «Крэпасць-герой». Робяць стужку рэжысёр М. Заслонава і аператар Ул. Арлоў.

«Народны артыст Ільінскі» — так называецца дакументальны фільм, над якім працуюць рэжысёр С. Сплашноў і аператар М. Бераў. Гэта стужка пра жыццё і творчы шлях народнага артыста СССР Аляксандра Ільінскага.

Паэт Анатоль Вялюгін напісаў сцэнарый да поўнаметражнага фільма «Пятае пакаленне». Здымаюць яго рэжысёр В. Сукманаў і аператар Р. Масальскі.

Малады кінааператар В. Ёркін і рэжысёр Ул. Віннікаў працуюць над стужкай «Перакрыжаванне». Пра электрыфікацыю гарадоў і вёсак Беларусі раскажа дакументальны фільм «Агні Беларусі» рэжысёра П. Алексірэнкі і аператара Ф. Осіпава.

На Мінскай студыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў ідуць здымкі і іншых карцін.

УПЕРШЫНЮ Ў ЦІТРАХ

Малады аператар студыі «Беларусьфільм» Віталій Нікалаеў дапамагаў А. Забалоцкаму здымаць фільмы «Праз магілкі» і «Альпійская балада». Але ў цітрах яго імя з'явілася ўпершыню. Нядаўна ён самастойна ўжо скончыў работу над кінанавелай па аповесці В. Быкава «Пастка». Наш карэспандэнт папрасіў рэжысёра гэтай стужкі Л. Мартынюка сказаць некалькі слоў пра маладога аператара. Вось што ён паведаміў:

— Працаваць з Віталіем прыемна. Ён заўсёды ў роздуме, у пошуках. Над кінакарцінай мы з ім працавалі нямала — 106 дзён. Неўзабаве яе ўбачаць гледачы. Калі карціна ім спадабаецца, у гэтым заслуга і Віталія Нікалаева.

НА «СУБОТНІМ КІНАЭКРАНЕ»

«Суботні кінаэкран» — так называюцца спецыяльныя выпускі Мінскай студыі тэлебачання. На іх старонках расказваецца аб тым, якія праблемы, думкі, героі хваляюць сёння майстроў савецкага мастацтва. Вось і апошні—ліпеньскі—«Суботні экран» пазнаёміў тэлегледачоў з новымі стужкамі беларускіх кінематаграфістаў. Пра сваю новую работу — фільм «Адкрытая размова» — расказаў рэжысёр беларускага дакументальнага кіно М. Хубаў.

З расказам аб створанай на «Беларусьфільме» мастацкай карціне «Іду шукаць» выступіў пастаноўшчык яе І. Дабралюбаў.

А трэцім удзельнікам перадачы была песня. Перадаваліся мелодыі І. Дунаеўскага, напісаныя для беларускіх фільмаў.

ПАКАЖА ТЭЛЕЭКРАН

У гарадскім пасёлку Свір, на прыгажуні-Нарачы ідуць здымкі мастацкага тэлефільма «Запруда» па апавяданню Ю. Нагібіна. Ставіць фільм Ул. Карасёў, здымае аператар заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Ул. Акуліч. Галоўныя ролі выконваюць артысты Ю. Саранцаў і Ю. Цоглін.

Неўзабаве тэлегледачы ўбачаць на блакітным экране дакументальны фільм «Аўтобус у іншыя гарады» рэжысёра Ю. Дубровіна. Гэта стужка пра нялёгкую, пачэсную працу шафёраў-міжгароднікаў.

Заканчваюцца здымкі тэлевізійнага дакументальнага фільма «Дзень на Лясным возеры». Цікава, што аўтарам сцэнарыя яго, рэжысёрам і аднасачова аператарам з'яўляецца В. Шаталаў. Ён упершыню ў беларускім тэлебачанні прымяняе падводныя здымкі.

Другі фільм — «На зачараваных плёсах», таксама пра прыгажосць роднага краю, здымае рэжысёр В. Цыбулька. Будучая стужка «Начная змена» прысвечана шахцёрам Салігорска.

50 год робіць мадэлі марскіх суднаў брэсцкі ўмелец Ігар Пятровіч Малюцін. Гэта зацікавіла работнікаў Мінскай тэлестудыі. Цяпер рэжысёр Ул. Арлоў і аператар В. Хайкін ствараюць тэлефільм пра Ігара Пятровіча.

ДРУЖБА І ЎСЕБАКОВАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Таварыш Л. І. Брэжнеў, М. В. Падгорны і А. М. Касыгін накіравалі 21 ліпеня таварышам Уладзіславу Гамулку, Эдварду Охабу і Юзефу Цыранкевічу прывітальнае пасланне, у якім перадаюць брацкаму польскаму народу сардэчныя віншаванні і найлепшыя пажаданні з выпадку нацыянальнага свята—22-й гадавіны адраджэння Польшчы і святкавання 1000-годдзя польскай дзяржавы.

Народная Польшча, гаворыцца ў пасланні, адзначае тысячагоддзе польскай дзяржавы як сацыялістычная краіна з эканомікай, навукай і культурай, якія бурна развіваюцца, з пастаянна растучым жыццёвым узроўнем насельніцтва. Няма сумнення, што рабочы клас, працоўнае сялянства і інтэлігенцыя Польскай Народнай Рэспублікі, упэўнена ідучы па шляху будаўніцтва сацыялізма, зробяць сваю радзіму яшчэ прыгажэйшай і багацейшай.

У пасланні адзначаецца, што Польская Народная Рэспубліка ўносіць вялікі ўклад у справу ўмацавання садружнасці сацыялістычных краін. Разам з іншымі сацыялістычнымі краінамі народная Польшча актыўна процідзейнічае агрэсіўнай палітыцы імперыялізму.

Савецкія людзі рады таму, што дружба і ўсебаковае супрацоўніцтва паміж СССР і ПНР з кожным годам мацнеюць і паглыбляюцца. Камуністычная партыя Савецкага Саюза, Савецкі ўрад і ўвесь наш народ, ажыццяўляючы рашэнні XXIII з'езда КПСС, будуць усямерна берагчы і ўмацоўваць дружбу з брацкай Польскай Народнай Рэспублікай.

ТАСС.

ПРЭМІІ 15-га МІЖНАРОДНАГА КІНАФЕСТЫВАЛЮ

Два тыдні з 6 па 19 ліпеня ў Карлавых Варах праходзіў юбілейны 15 Міжнародны кінафестываль.

У конкурсе на атрыманне галоўнага прыза—«Крыштальны глобус» удзельнічалі фільмы сацыялістычных краін, Італіі, Францыі, ЗША, Японіі, ААР і інш.

Савецкую кінематаграфію прадстаўляла карціна літоўскага кінарэжысёра В. Жалакявічуса «Ніхто не хацеў паміраць», якая заваявала першы прыз на Усесаюзным кінафестывалі ў Кіеве. Па-за конкурсам дэманстраваўся савецкі фільм «Наташа Растова»—другая серыя «Вайны і міру».

19 ліпеня ўрачыста былі аб'яўлены вынікі конкурсу. Па рашэнню міжнароднага журы пад старшынствам прафесара М. А. Броусіла вялікі прыз «Крыштальны глобус» не быў прысуджаны ніводнаму з фільмаў. Замест гэтага журы ўстанавіла не дзве, а тры галоўныя прэміі. Першая галоўная прэмія прысуджана югаслаўскаму фільму «Тры» (рэжысёр А. Пятровіч), другую атрымаў венгерскі фільм «Халодныя дні» (рэжысёр А. Ковач), трэцяй галоўнай прэміі ўдастоены чэхаславацкі фільм «Экіпаж у Вену» (рэжысёр К. Кахінь). Усе гэтыя фільмы прысвечаны падзеям другой сусветнай вайны. Журы не прысудзіла прэміі за лепшае выкананне жаночай ролі, а ўстанавіла дадаткова яшчэ адну прэмію за лепшае выкананне мужчынскай ролі. Іх атрымалі савецкі акцёр Данатас Баніёніс за стварэнне вобраза старшыні калгаса ў фільме «Ніхто не хацеў паміраць» (рэжысёр В. Жалакявічус) і балгарскі акцёр Наум Шопаў за выкананне ролі цара Барыса ў фільме «Цар і генерал» (рэжысёр В. Радзеў).

Журы падзяліла сваю спецыяльную прэмію паміж кубінскім сатырычным фільмам «Смерць бюракрата» і французскай кінакамедыяй «Жыццё ў замку».

УМЕЛЬЦЫ БРЭСТЧЫНЫ

Брэстчына здаўна славіцца народнымі ўмельцамі, якія займаюцца разьбой па дрэву, вышыўкай, ткацтвам.

Нядаўна Мастацкім фондам БССР і Брэсцкім абласным Домам народнай творчасці праведзены семінар народных умельцаў вобласці.

На семінары чыталіся лекцыі па пытаннях выяўленчага мастацтва, праводзіліся экскурсіі ў мастацкія музеі і на прадпрыемствы, якія выпускаюць мастацкую прадукцыю, наладжваліся сустрэчы з мастакамі-прафесіяналамі, кансультацыі, абмен вопытам, абмеркаванне твораў народнага мастацтва. Лепшыя творы ўдзельнікаў семінара рэкамендаваны на мастацкія выстаўкі і для масавай вытворчасці. Многія тканыя работы, дыванкі, дарожкі, разбярства, інтарсія, дэкаратыўныя пано, точаныя драўляныя сувеніры, творы жывапісу і скульптуры народных умельцаў Брэстчыны ўзяты для рэалізацыі праз салон Мастацкага фонду БССР. Рад твораў будзе тыражыравацца самімі народнымі майстрамі.

Хто яны, гэтыя людзі, якія ствараюць сапраўдныя шэдэўры народнага мастацтва? Дзе вучыліся яны свайму майстэрству?

Гэта настаўнікі, рабочыя, калгаснікі, пенсіянеры — людзі самых розных прафесій, а мастацтва — іх другое прызванне.

З. Шкупава — фінансіст. Цяпер на пенсіі. Каля пятнаццаці гадоў прымае ўдзел у рабоце Дома народнай творчасці. Яна — актыўны ўдзельнік абласных выставак народнай творчасці. З задавальненнем перадае свой творчы вопыт маладому пакаленню.

Вось яе работа «Мы з табою, В'етнам». Простымі выяўленчымі сродкамі аўтар раскрывае задуму. На невялікім габелене выразна размешчаны дэкаратыўныя выяўленчыя элементы: герб Беларускай ССР, герб Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам, абрысы тэрыторый Беларускай ССР і Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам, сімвалічнае адлюстраванне рук, самкнутых у поціску. Гэтыя выяўленчыя элементы добра скампанаваны і падкрэслены дзвюма стужкамі з беларускім і в'етнамскім нацыянальнымі арнаментамі.

У іншых работах майстра заўважаецца некаторая перагружанасць выяўленчымі элементамі, эклектызм. Пра гэта гаварылася на семінары.

Добрае ўражанне пакідаюць работы майстра В. Гаўрылюка. Асабліва спадабаўся мастацкаму савету дыванок са звычайнай саломы. Удалае перапляценне дробных і буйных саломінак ставае арыгінальны дэкаратыўны ўзор. Такія дыванкі, на думку спецыялістаў, будуць карыстацца попытам у насельніцтва, бо адпавядаюць нашаму сучаснаму інтэр'еру.

В. Гаўрылюк паказала і арыгінальныя тэматычныя творы, выкананыя своеасаблівай тэкстыльнай мазаікай. Адлюстраванне набіраецца асобнымі каляровымі кавалачкамі матэрыі, аўтар дамагаецца арыгінальнай каляровай гамы. У гэтай тэхніцы В. Гаўрылюк выканала і дыванок з партрэтам Ул. І. Леніна. Ён рэкамендаваны мастацкім саветам на рэспубліканскую выстаўку.

Цудоўная тэматычная разьба, у большай частцы анімалістычнага характару, захапляе ў творах начальніка пажарнай аховы І. Лука. Яны вабяць дасканаласцю і тонкасцю выканання, добрым пачуццём кампазіцыі. Майстар спрабуе сілы і ў партрэтным мастацтве. Яго работа «Уладзімір Ільіч Ленін» рэкамендавана мастацкім саветам на рэспубліканскую выстаўку.

Арыгінальныя, выкананыя ў лепшых нацыянальных традыцыях творы настаўніка В. Механікава. Яго драўляныя кубкі, салонкі, вазачкі, попельніцы, дэкаратыўныя вешалкі і інш. вызначаюцца разнастайнасцю форм і спосабаў дэкарыравання. Асабліва ўдалае спалучэнне чыстага непаліраванага дрэва з дэкорам, выкананым спосабам выпальвання. Іменна ў гэтых работах аўтар здолеў знайсці новае вырашэнне формы і дэкору, беражліва захаваўшы нацыянальны каларыт.

Шмат працуе славуты майстар П. Казелка. Цяпер ён рыхтуе рад кампазіцый з цыкла «Гісторыя беларускага народа». Работы прысвячаюцца 50-годдзю Савецкай улады.

Творы самадзейных жывапісцаў, скульптараў, графікаў Брэстчыны вызначаюцца пільнай увагай да навакольнага жыцця.

Народным майстрам вобласці творча дапамагаюць брэсцкія мастакі І. Фяцісаў, М. Чураба і іншыя. Шкада, што прафесіяналы - прыкладнікі дыванова камбіната пасіўна ставяцца да народнага мастацтва. А цяпер жа вунь як неабходна іх дапамога народным майстрам!

Хочацца спадзявацца, што неўзабаве з'явяцца новыя творы народных майстроў Брэстчыны, яшчэ лепшыя, чым паказаныя на семінары.

В. ГАЎРЫЛАЎ, мастак.

БЕЛАРУСКІЯ …

**Вялікім поспехам у …
выстаўка беларускага ж…
раў. На ёй было предст…
год» М. Савіцкага, «Апс…
і Б. Уса, «М. В. Фрунзе…
знанне» Р. Кудрэвіч, «…
соўскі ў ганаровай варт…**

**Перасоўныя выстаўк…
воінскіх часцях былі а…
стацкай выстаўкі «На …
да гэтага часу. Воіны …
вапісцаў на ваенна-пат…**

**Поспехам у гарнізона…
больш шасцідзесяці ра…
была паказана ў свой …
часці пабывалі аўтары …
салдатам і афіцэрам а…**

Восем гадоў назад у калгасе «Шлях Леніна» Браслаўскага раёна быў створаны секстэт народных інструментаў. Кіруе ім бібліятэкар сельгасарцелі Зінаіда Пальчэўская.
На здымку — самадзейныя артысты на рэпетыцыі.

Фота І. ЗМІТРОВІЧА (БЕЛТА).

ДЗЕСЯЦЬ ДЗЁН, ЯКІЯ НЕ ЗАБУДУЦЦА

Дзесяць дзён на маляўнічым беразе Нарачы дружнаю сям'ёй жылі ўдзельнікі семінара творчай моладзі рэспублікі. Дзесяць дзён знаёмстваў, роздумаў, дыскусій... Упершыню сабраліся разам маладыя літаратары, мастакі, кампазітары, кінарэжысёры, выканаўцы. Даўно ўжо адчувалася патрэба ў такой сустрэчы, у такой «садружнасці муз».

Нарачанскі семінар запомніцца яго ўдзельнікам не толькі сваёй шчырай сяброўскай атмасферай, радасцю асабістага знаёмства з таварышамі па творчай працы, а, перш за ўсё, зацікаўленай, прынцыповай гаворкай аб важных праблемах развіцця сённяшняй літаратуры і мастацтва: аб метадзе сацыялістычнага рэалізму ў жывапісе і паэзіі, аб сацыяльным заказе і яго значэнні для мастака і грамадства, аб месцы творчай інтэлігенцыі ў барацьбе за камунізм...

Семінар яшчэ раз паказаў, што ў нашу літаратуру і мастацтва прыйшоў вялікі атрад маладых творцаў, якія хочуць сказаць сваё ўсхваляванае, прачулае слова пра час і пра сучаснікаў, паўсядзённа думаюць над вострымі праблемамі нашага веку, шукаюць сваіх дарог у творчасці. Ён яшчэ раз паказаў адзінства імкненняў прадстаўнікоў розных жанраў і відаў мастацтва — быць заўсёды па-грамадзянску страснымі, знаходзіцца ў самай гушчы падзей.

Семінар закончыўся. Яго ўдзельнікі раз'ехаліся ў розныя куткі рэспублікі, раз'ехаліся, каб працаваць. Думаецца, што семінар узбагаціў многіх, падказаў новыя тэмы, яшчэ больш абудзіў творчую думку кожнага.

Наш карэспандэнт папрасіў некаторых удзельнікаў творчага семінара падзяліцца ўражаннямі, думкамі. Вось што яны сказалі:

Давід СІМАНОВІЧ,
паэт

— Напружаныя будні семінара не забудуцца. Не забудуцца спрэчкі, дыскусіі, абмеркаванні. Не забудуцца і святы. А іх таксама было шмат.

Мы віншавалі з перамогай маладога рэжысёра Ігара Дабралюбава на прэм'еры яго фільма «Іду шукаць», радаваліся цікавым работам Барыса Заборава (мне асабліва спадабаўся яго «Партрэт Маякоўскага»), акварэлям Генадзя Шутава (між іншым, дзве з іх былі створаны тут, на Нарачы). Не было абыякавых і на вялікім літаратурным вечары, які стаў сапраўдным святам паэзіі, калі выступіла цэлае сузор'е маладых паэтаў — ад семнаццаці да трыццаці год.

Як свята, запомніў я асабіста і сустрэчы з творамі маіх новых сяброў — скульптара Івана Міско, мастака Міхася Лісоўскага, кампазітара Дзмітрыя Смольскага, драматурга Анатоля Дзялендзіка...

Хочацца верыць, што такія семінары, такія сустрэчы стануць у нас традыцыйнымі.

Іван МІСКО,
скульптар

— Усе дзесяць нарачанскіх дзён былі цікавымі. Скажу нават больш — незабыўнымі. Але асабліва мне запомніўся турысцкі паход па партызанскіх сцежках. Вялі нас былыя партызаны, людзі, якія шмат пабачылі і перажылі. Калі мы спыняліся на месцы былых партызанскіх могілак, каля былых зямлянак, мне здавалася, што ў гэты момант у сэрцы многіх з нас нараджаюцца новыя творы, вельмі дарагія, вельмі значныя. Я веру, што ўбачу гэтыя творы ў сваіх сяброў-мастакоў, прачытаю ў сяброў-паэтаў, пачую ў сяброў-кампазітараў.

Сустрэчы на Нарачы былі для мяне вельмі прыемнымі і карыснымі. Пасля іх, напрыклад, я ўжо буду больш пільна прыглядацца да паліц кнігарняў — я не магу прапусціць ніводнай новай кніжкі тых, з кім так добра пасябраваў. Я думаю таксама стварыць цэлую галерэю скульптурных партрэтаў удзельнікаў семінара, бо веру, што ў многіх з іх наперадзе вялікая творчая будучыня.

Калі быў дзень эстэтыкі, мы закранулі пытанні эстэтычнага выхавання школьнікаў. Хочацца верыць, што ўсе ўдзельнікі семінара будуць прымаць самы актыўны ўдзел у гэтай вялікай і высакароднай справе — эстэтычным выхаванні моладзі і, мне думаецца, што на наступных семінарах (а што яны павінны стаць традыцыйнымі — маё перакананне) гэтаму будзе ўдзелена больш увагі.

І яшчэ адно асабістае пажаданне. Мы прагледзелі цікавы дакументальны фільм Мікіты Хубава «Шчырая размова». Гэта фільм аб сучаснай моладзі, аб яе шляхах у складанае і нялёгкае жыццё. Фільм цікавы, хоць, магчыма, месцамі і спрэчны. Хацелася б сустрэцца з яго героямі яшчэ раз — гадоў так праз пяць-дзесяць...

Ігар ДАБРАЛЮБАЎ,
кінарэжысёр

— Я, відаць, паўтаруся, але не магу не сказаць, што гэты семінар быў і вельмі цікавы, і вельмі патрэбны. Мы ўпершыню блізка пазнаёміліся адзін з адным, падзяліліся творчымі планамі, думкамі аб сённяшнім дні нашай літаратуры і мастацтва. Гэта было здорава, і дзякуй Цэнтральнаму Камітэту камсамола рэспублікі, што ён наладзіў нам такую сустрэчу.

Для мяне, у прыватнасці, вельмі прыемнай была сустрэча з многімі старымі знаёмымі, былымі студэнтамі універсітэта. Мы з імі сустракаліся некалі ў аўдыторыях, а цяпер вось сустрэліся на семінары, і як прыемна было даведацца, што адзін з іх стаў вядомым паэтам, другі — вучоным, трэці — празаікам... Усё гэта дае магчымасць нібы неяк па-новаму глянуць на чалавека, на таго самага чалавека, якога мы называем гучным імем — сучаснік.

А калі гаварыць «утылітарна», то я знайшоў на Нарачы для сваіх новых фільмаў і будучых мастакоў, і будучых аўтараў песень, і, так хочацца верыць, — сцэнарыстаў. Гэта, відаць, галоўнае.

На Нарачы ў нас завязалася добрая творчая садружнасць. Хочацца, каб яна працягвалася, мацнела. Таму, мне думаецца, час ужо адкрыць у Мінску клуб творчай моладзі, дзе маглі б сустракацца, гутарыць, спрачацца літаратары, артысты, кампазітары, мастакі. Патрэба ў такім клубе адчуваецца даўно, і гэта мы яшчэ раз адчулі на нарачанскім семінары.

Усе мы — паэты, кінематаграфісты, музыканты, мастакі — заклікаы рабіць адну агульную вялікую і высакародную справу па выхаванню чалавека камуністычнага грамадства. І таму нам трэба заўсёды дружыць, заўсёды дапамагаць адзін аднаму, заўсёды быць побач...

□ □ □

Ніжэй мы змяшчаем падборку вершаў маладых паэтаў — удзельнікаў семінара, а таксама сяброўскія шаржы М. Лісоўскага, зробленыя ім на Нарачы.

Спектаклі нашых гасцей

НА ФОНЕ ТРАГЕДЫІ НАРОДНАЙ

«СПЫНІЦЕСЯ!» І. РАЧАДЫ НА СЦЭНЕ ТЭАТРА ІМЯ ІВАНА ФРАНКА

ВОСЬ яны маршыруюць, салдаты бундэсвера. У іх такая ж шэрая форма, і той жа гусіны крок, як у гітлераўскіх малойчыкаў. І ідуць яны зусім, як тады. Але не... Сівая жанчына, якая страціла ў вайну двух сыноў, і мужа, перагароджвае іх шлях:

— Спыніцеся! Нямецкая маці заклікае вас! Спыніцеся!..

Так заканчваецца спектакль тэатра імя Івана Франка «Спыніцеся!».

Пра што ён? Пра цяперашніх нацыстаў, якія прагнуць рэваншу, і пра неабходнасць процістаяць ім. Пра тое, што няма «тэрміну даўнасці» для злачынстваў супраць чалавека і чалавечнасці. Пра вайну, пра тое, чаму мы спачатку адступалі. Пра бітву на Волзе. Пра тое, як стала відучай нямецкая маці. Пра культ асобы...

Усё пачалося ў дзень нараджэння камандуючага войскамі ГДР генерала Вальтэра Рахенау. У госці да яго прыйшоў камандуючы савецкімі войскамі ў Германіі генерал-палкоўнік Углін з жонкай Аленай Дзмітраўнай і прыёмным сынам. Прыйшлі павіншаваць Вальтэра брат яго Генрых Рахенау, генерал у адстаўцы, і сястра Анна — жонка генерала фон Рыхтэра, які загінуў на Волзе. Апынуўся на вечары і нехта Штумберг-Бычэўскі — рускі, здраднік, былы муж Алены Дзмітраўны. Вось ён і расказвае фрау Анне, што генерал Углін забіў яе мужа, які здаўся ў палон, а сына яе Ганса забіла жонка Угліна, вось на фота яна з нажом, а ля яе ног ...твы Ганс. Саўдзельнік Штум...-Бычэўскага Мюлер патра...рау Анна адпомсціла за ... яна павінна падаць ...ў бакале з шам...берг тым часам ...тку генерала і ...о зону як за-... супа... ...цый і ...ошкі ...а і

...яе святым праве? А тут аўтар прымушае Алену апраўдвацца, ставіць яе ў нейкае недарэчнае становішча. На жаль, у п'есе гэта не адзіная недарэчнасць. Чамусьці, напрыклад, генералы Рыхтэр і Рахенау даручаюць палоннаму рускаму афіцэру Бычэўскаму адшукаць жанчыну, якая забіла Ганса, і даюць яму злашчасную фатаграфію...

Зрэшты, даволі пра лёс генералаў і іх сем'яў, бо падзеі іх асабістага жыцця разгортваюцца на фоне вайны — трагедыі народнай. Фон гэты пададзены ў эпізодах. Трэба неяк паказаць ход вялікіх падзей, і тады з'яўляюцца на п'едэстале-дарозе жывыя карціны: «бежанцы», «адступленне», «прарыў», «бой»... Часцей за ўсё яны ідуць, як пантаміма. Часам у вусны фігур-штампаў укладаюцца фразы-штампы. Так, у сцэне «акружэнне» ёсць баец, які памірае, баец, які трызніць, баец, які просіць піць, і баец, які вельмі хоча пачуць «Лявоніху»...

Рэжысёр спектакля народны артыст УССР Ул. Склярэнка вельмі ўжо беражна следуе кожнаму ходу п'есы. У сцэне балю ў Герынга І. Рачада прапануе «разгульны танец». І, ідучы за яго жаданнем, рэжысёр ставіць «танец чорнарубашачнікаў», у канцы якога даму, зацягнутую ў чорнае трыко, уздымаюць на стол, дзе яна застывае ў эфектнай позе з мечам у руцэ...

Такіх «пэрлаў» у спектаклі нямала. Калі ж ён усё ж такі прымаецца гледачамі, дык гэта дзякуючы майстэрству акцёраў. Таленавіты калектыў здолеў самыя неверагодныя становішчы зрабіць больш ці менш праўдзівымі. Акцёры прыклалі ўсе намаганні, каб стварыць жывыя характары, і некаторым гэта ўдалося. Нельга не хвалявацца, гледзячы на Анну фон Рыхтэр у выкананні народнай артысткі СССР Н. Ужвій. Мы ...рым у прасвятленне нямецкай ...ці, якая ўсвядоміла неабход...сць барацьбы. У заключнай ...эне Анна—Ужвій узнімаецца да праўднага трагізму.

Баязлівым, подлым, нахабным ...абіў свайго Штумберга-Бычэў...ага заслужаны артыст УССР ... Дашэнка. Надзялілі жывымі ...самі сваіх герояў народны ар...ст УССР П. Сергіенка (гене...л Углін), заслужаны артыст ...СР А. Амяльчук (Генрых Ра...нау) і заслужаны артыст УССР ... Давыдзенка (генерал фон Рых...). Удачай спектакля можна лі...ць і вобраз Мюлера ў выка...ні артыста К. Сцепанкова. За...інальны вобраз сяржанта Кузь...кі стварыў заслужаны артыст ...СР Н. Якоўчанка, хоць па ро... ў яго ўсяго тры фразы...

...сць тэмы — да іх належыць ...ма вайны і міру, — на якія ...можа не адгукацца сэрца. На...на таму і знаходзіць водгук у ...дача спектакль «Спыніцеся!» ...п'есе І. Рачады.

Мая ГАРЭЦКАЯ.

Яўгення ЯНІШЧЫЦ

БЕЛАРУСІ

О, Беларусь! Азёрная старонка,
Пастаў мяне бярозкаю ў палях.
Хачу ліствой мядзвянаю і звонкай
Услаць табе твой прамяністы шлях.

Зялёнай самай, самаю шумлівай
Хачу я ў спёку летнюю цвісці,
Каб падзяліцца шчасцем
з нешчаслівым,
Каб падзяліцца сонцам у жыцці.

О, Беларусь!
Мая зара над вёскай,
Мае сустрэчы, радасці, агні...
Хачу заўжды зялёнаю бярозкай
Шумець сярод тваіх азёр і ніў.

■ ■ ■

Будуць вёсны і пралескі,
Будзе радасць і туга.
Адцвіце вясна на ўзлеску
Пабяжыць за сіні гай.

І хваёвую іглiцай
Адзавецца лета звон.
Толькі мне не паўтарыцца
Ні вясною, ні зімой.

Столькі думак самых шчырых!
Светлы шлях мне пажадай.
Заўтра будзе сіні вырай
І бясконцы небакрай,

Будзе лета з навальніцай
І вясёлка над ракой.
Толькі мне не паўтарыцца
Ані летам, ні зімой.

■ ■ ■

Да сустрэчы. Да сустрэчы.
Белы вецер. Сіні дзень.
Ходзіць сонца па зарэччы,
Мочыць косы у вадзе.

Над вадою дзве вярбіны,
Дзве журботныя сястры.
Па-над цёплай лугавінай
Ноч запальвае кастры.

Нібы лебедзь, едзе човен
Паміж лотацяў рачных.
Цёплы вечар. Месяц поўны
Тчэ над заваддзю ручнік...

Пінскі раён.

Іван Арабейка, паэт

Дзмітрый Смольскі, кампазітар

Мікалай Круноўскі, спецыяліст па эстэтыцы

Ігар Дабралюбаў, кінарэжысёр

Барыс Забораў, мастак

Давід Сімановіч, паэт

Уладзімір ПАЎЛАЎ

ГАЛОЎНЫ КАЛІБР

Не танцаваць «Лявоніхі» ў Замошшы.
Не біць бы бубну ў прыцемках,
калі б
У паграбах не мелі мы той ношы,
Імя якой — галоўны наш калібр.
Ён устае завостраным алоўкам,
Пад ім ідзе упрысядкі карма,
Прывінчана яму боегалоўка,
Дзе ні адзінай звіліны няма.
Вялікі боль і сорам чалавека, —
Пра гэта кожны склад мой і радок, —
Дажыў да нас, да атамнага веку,
Адвечны, самы дзікі парадокс.
Са злітка людзі ліст рабілі тонкі,
Але спярша, чым ад яго адсеч
Палоску на вянчальныя пярсцёнкі,
У пазалоту убіралі меч.
Я слаўлю меч, які капаў аблогу
І майстраваў калыску і засек,
Які сабой абараніў малога
І свастыку фашысцкую рассек.
Спрадвечна славяць светлы мір
паэты,
Не моўкне песня іх узнёслых лір...
І я б не ўспомніў нават пра ракеты,
Пра грозны і галоўны наш калібр,
Калі б жыцця усіх людзей харошых
Знойку не зацягвала сіло,
Калі б на Волзе і ў маім Замошшы
Брацкае магілы не было.

ПАЛАХЛІВЫЯ БЛІСКАВІЦЫ

Пройдзе дождж і абросіцца луг,
І пацягне ад лесу жывіцай,
І відно, як згараюць наўкруг
Палахлівыя бліскавіцы.

І тады ў прамоклых садах
Салаўі зноў раскладваюць ноты.
Адпаўзлі на аглухлых басах
І вуркочуць здаля грымоты.

Там на колкія ячмяні
Летні дождж асыпаецца спорны.
А тут моўчкі ў начной цішыні
Ападаюць, бы яблыкі, зоры.

З тых лугоў я іду.
А за мной,
Каб не раз дзіўнай казкай сасніцца,
Непагасна гараць над зямлёй
Палахлівыя бліскавіцы.

г. Мінск.

Іван АРАБЕЙКА

ЖУРАЎЛІНЫЯ АБОЗЫ

Бярозы, чорна-белыя бярозы,
Шлагбаўмамі ўздыблены ў зеніт,
Туды, дзе журавліныя абозы
Журбу і адзіноту узнялі.

Самотна, запаволена і тайна,—
Здаецца, што плывуць, а не ляцяць,
І дзюбы іх з напевам развітальным
Нямазанымі коламі рыпяць.

А ранак ружавее асцярожна.
Даверліва на плечы жураво̆
Ускінуў ён паклажаю дарожнай
Хусцінкі кучаравых аблакоў.

ПРАДЧУВАННЕ

Углядаюцца вязы ў прадвесне,
Карасі пазіраюць праз лёд.
Хутка, хутка нястрымнаю песняй
На рацэ загудзе ледаход.

Ручаіны прачнуцца бадзёра,
Будуць лодачкі дзеці пускаць,
Будуць крыгі ў вясновым напоры,
Як ліні, цераз кладку скакаць.

Прыйдзе к нам сакавік апантаны,
І з пралалін зірне верасок,
І ў бярозавым голлі фантанам
Ірванецца астуджаны сок...

п. Бярозаўка,
Гродзенская вобласць.

Вольга ІПАТАВА

КАЛОЖА

Ад сонца засланіўшыся далоняй,
Туманам сінім атуліўшы плечы,
Стаіць вяні над Нёманам Каложа,
Нібы жанчына у чаканні вечным.

Калісьці да каханага за горад
Насустрач бегла верасам калючым,
А потым, скамянелая ад гора,
Урасла навек у нёманскія кручы.

За ёю — цёплых ліўняў агароджа,
Над ёй — смуга падзей і далячыняў...
Стаіць вяні над Нёманам Каложа
Сівою беларускаю жанчынай.

■ ■ ■

Ліпнёвы поўдзень. На зямлі спакой.
Аж парыжэлі верасы ад спёкі.
Руды узгорак пад маёй шчакой
Здаецца мне наровы цёплым бокам.

А сосны разамлелі ў цішыні.
Адно ручай звініць спрадвечным
плачам.
...І сплю я, абхапіўшы шар зямны,
Нібы дзіця жывот ласкавы матчын.

г. Гродна.

Леў БАРТОШ

■ ■ ■

Хай нясе мяне лёс куды хоча —
У шэрасць дзён ці ў блакітны
працяг,
Абы толькі іскрыліся вочы
Ды не гаслі пачуцці ў грудзях.

Я шчаслівы. Я зведаў удачу
І ніколі не гнуўся ў дугу.
Магу ў цемрадзі сонца убачыць,
І скрозь слёзы смяяцца магу.

Ніякія жыццёвыя страты
Не загасяць маё пачуццё.
Я ўлюбёны ва ўзгоркі і хаты,
Я да скону ўлюбёны ў жыццё.

г. Масты
Гродзенская вобл.

Таццяна ДЗМІТРУСЁВА

МОЙ РОДНЫ КУТ

Хаціны паўзбіраліся на ўзгорак,
На шыбы лёг бяроз паўдзённы цень.
У небе—сінім разамлелым моры—
На крылах носяць ластаўкі прамень.

Над рэчкай наша вёска невялічкая,
Сярод лугоў — нібыта ў дыванах.
Альшанкаю рачулку нашу клічуць.
Завецца вёска Нізкамі здаўна.

І ты такіх бяроз нідзе не знойдзеш.
Другой такой рачулкі не шукай.
Навекі застанешся тут,
як зойдзеш
У наш суніцамі прапаслы гай...

в. Нізкі,
Касцюковіцкі раён.

УЛЮБЁНЫ Ў ЗЯМЛІ КРАСАВАННЕ

ШКАДА, што мы не прывыклі гаварыць адзін аднаму прыемных слоў у будзённі, не прызвычаіліся ўголас ...вацца ўдачам і поспехам тава...а. Можа гэтаму замінае заліш...сціпласць, а можа звычайная ...кавасць. Вось і адкладваем ...шчырыя выказванні да чарго...юбілею. А юбілеяў прыходзіц...акаць доўга: першага — цэлае ...гагоддзе, наступных — кожныя ...д.

...ння якраз той дзень, калі ...а многае сказаць пра майго ...ага друга Уладзіміра Юрэвіча, разам успомніць ладны кавалак жыцця і парадавацца, што юбіляр прыйшоў да «круглае» даты не з пустымі рукамі, пажадаць яму большых радасцей і плёну на наступную пяцідзесяцігодку.

Часцей за ўсё юбілейныя прамоўцы азіраюцца на пройдзены шлях. Вось і я ўспомніў, што Уладзіміра Юрэвіча ведаў задоўга да таго, як упершыню сустрэўся і пазнаёміўся з ім. Недзе ў самым пачатку трыццатых гадоў я кожны дзень слухаў, як прыемны барытон абвяшчаў па радыё: «Увага! Гаворыць Менск. Радыёстанцыя РВ-10!» Дыктар Юрэвіч чытаў апошнія паведамленні, чытаў вершы, лекцыі для завочнікаў партыйнага навучання, вёў рэпартажы з парадаў і дэманстрацый. Яго тады ведала ўся Беларусь. Калгаснікі і раённыя работнікі, прыязджаючы ў Мінск на экскурсію, прасілі сярод іншых выдатнасцей сталіцы паказаць ім «таго, што так добра гаворыць у радзіву». І паказвалі. Семнаццацігадовы юнак чырванеў і губляўся перад салідными людзьмі, якія хацелі на яго толькі паглядзець. Дзівіўся і я яго маладосці і зайздросціў папулярнасці. Потым некалькі гадоў разам працавалі з Валодзем Юрэвічам і яго старэйшым братам Алесем на Беларускім радыё.

Ніякіх магнітафонаў і плёнак у тыя гады не было. Усё чыталі, як кажуць, «жыўцом», а пісалі, як і цяпер, як хто ўмеў. Але ў эфір перадачы ішлі з дасканала адрэдагаваным стылем. Аказваецца, усе недарэчнасці, моўныя і сэнсавыя недакладнасці перад мікрафонам выпраўляў дыктар Уладзімір Юрэвіч. А потым яго голас пачулі з экранаў кінатэатраў. Ён чытаў тэксты амаль да ўсіх першых беларускіх дакументальных фільмаў. Мне здавалася, што гэты маладзейшы за мяне хлопец жыве ў нейкай іншай, вышэйшай сферы. Яно так і было. Ён працаваў на радыё і вучыўся на будаўнічым факультэце політэхнічнага інстытута, а ў сэрцы жыла любоў да літаратуры, душа была чуйнаю да ёмістага вобразнага народнага слова, і ён паступае завочна вучыцца на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Уладзімір Юрэвіч спрабаваў свае сілы, выбіраў сапраўдны шлях. Перамагла літаратура.

У гады Вялікай Айчыннай вайны голас Уладзіміра Юрэвіча чулі ў партызанскіх зямлянках, яго палымяныя артыкулы даходзілі да сэрцаў мільёнаў людзей на часова заняволенай беларускай зямлі. Ён быў у той грозны час у баявым страі, працаваў дыктарам, рэдактарам, перакладчыкам і аўтарам многіх перадач радыёстанцыі «Савецкая Беларусь». Уладзімір Юрэвіч ваяваў вострым пяром і палымяным словам. Гэтай зброяй ён дасканала валодае і цяпер. Дакладнае слова і думка, тонкі мастацкі густ, веданне жыцця, гісторыі народа, літаратуры, партыйная прынцыповасць і страснасць — усё зайздросна спалучылася ў маім добрым сябры. Вось ужо пяцьдзесят гадоў ён ходзіць па зямлі, улюбёны ў яе красаванне, па-юнацку захоплены легнімі світаннямі і гоманам спрадвечных бароў, сінімі зімовымі надвячоркамі і зіхатлівымі прадвеснямі. А больш за ўсё ўлюбёны ў людзей, якім ён прыносіць асалоду сваёй працай, сваім словам, усім сваім жыццём.

«Слова! Яно неабсяжнае, як сусвет, невычэрпнае, як акіян. Слова ўсюды прысутнае і скрозь дасягальнае, нібы тыя радыёхвалі. Слова ўсемагутнае, бо закранае самыя тонкія струны душы чалавечай — здольна сушыць гора, выклікаць весялосць, натхніць на подзвіг, спыніць злы намер, абудзіць да дзеяння цэлыя народы», — піша Уладзімір Юрэвіч у кнізе «Слова і вобраз». Толькі дасканала валодаючы словам, можна так глыбока і тонка разумець і адчуваць яго сілу і значэнне. Чытаючы артыкулы крытыка і публіцыста Уладзіміра Юрэвіча, бачыш, як тонка адчувае ён не толькі сэнс слова, а ўсе яго адценні і нюансы, ведае яго смак і колер, пах і вагу.

Гаворачы пра творы Кузьмы Чорнага, Янкі Брыля, Івана Мележа, Васіля Быкава, Івана Шамякіна, разглядаючы кнігі нашых класікаў і зусім маладых пісьменнікаў, Уладзімір Юрэвіч стараецца пранікнуць у лабараторыю аўтара. Ён выступае як добразычлівы, але прынцыповы друг пісьменніка, як добры дарадчык чытача. Пра гэта сведчаць яго кнігі. Але крытыка застаецца крытыкай. Яна не месціць у межах жанру ўсяго, што хоча і можа сказаць чалавек з тонкім густам, абвостраным зрокам і чуйнасцю да слова.

Часцей за ўсё крытыкамі становяцца людзі, якія некалі самі спрабавалі пісаць вершы або апавяданні. А каб крытык у сталым узросце, з вядомым імем, узяўся за прозу, гэтакае здараецца не так часта. У апошнія гады Уладзімір Юрэвіч паспяхова выступае як апавядальнік. Ён піша пра дзяцей і для дзяцей, пра іх клопаты і мары, пра іх знаходкі і расчараванні. Героя многіх апавяданняў Юрэвіча, хлопчыка Тараску, палюбілі тысячы беларускіх дзяцей. Яны ідуць следам за ім, стараюцца быць такімі ж добрымі, сумленнымі, працавітымі і ўважлівымі да людзей, як і ён.

Але і проза часамі здаецца цеснаватай майму даўняму другу. Яму патрэбна аўдыторыя куды большая, чым тыраж кніжкі ці часопіса. Ён не можа не падзяліцца з юнымі сябрамі сваімі думкамі, клопатамі і хваляваннямі. Яму хочацца раскрыць перад дзецьмі ўсе скарбы, таямніцы і багацці роднай мовы, разбудзіць іх творчую думку, памагчы прабіцца добрым парасткам у душы маленькіх грамадзян. Так узнік радыёклуб «Жывое слова». Яго нязменны старшыня і кіраўнік — Уладзімір Юрэвіч. Ён, сапраўды, сее разумнае, добрае, вечнае, дапамагае выхоўваць самыя канкрэтныя патрыятычныя пачуцці ў тых, што ідуць нам на змену. Сотні і сотні лістоў-водгукаў, лістоў-споведзей і пытанняў прыходзяць на імя старэйшага друга і дарадчыка Уладзіміра Юрэвіча.

Заўсёды «душою» любой рэдакцыі з'яўляецца адказны сакратар. А ў рэдакцыі часопіса «Маладосць» ёсць вельмі добрая і разумная душа. Завецца яна — Уладзімір Юрэвіч. Бо і ў самога сакратара душа маладая, кіпучая, няўрымслівая, неспакойная, крышталёва чыстая. Я не ведаю чалавека, які б крыўдзіўся на Уладзіміра Міхайлавіча, калі ён гаворыць у вочы хоць і жорсткія, але справядлівыя рэчы. Бо гаворыць і піша ён з вялікім тактам, з пачуццём беражлівай добразычлівасці і прыязні. Ён любіць людзей, а людзі любяць яго. Гэта зайздросная ўзаемная любоў.

Нарэшце хочацца сказаць некалькі і прыватных слоў майму даўняму добраму другу.

Дарагі Уладзімір Міхайлавіч, павер майму вопыту, што пяцьдзесят гадоў не такі ўжо высокі рубеж. Пераскоч яго і пачынай лічыць гады з аднаго і да наступнай паўсотні. Заўсёды заставайся такім жа маладым, шчырым і верным партыйным прынцыпам і перакананням, такім жа дбайным і чуйным да роднага слова, адданым роскві-ту беларускай савецкай літаратуры і культуры, будзь душою і добрым другам нашай слаўнай моладзі.

Сяргей ГРАХОЎСКІ.

NIECH ŻYJE POLSKA LUDOWA!

НАРОДНАЯ ПОЛЬШЧА СВЯТКУЕ СВАЁ ТЫСЯЧАГОДДЗЕ

Песні з па-над Віслы

Станіслаў Рышард ДАБРАВОЛЬСКІ

ПАЛАНЕЗ

Гадоў мінулых спеў, звіні,
Як рэха, ў юнай песні.
Цябе мы ў сённяшнія дні,
Як добры скарб, прынеслі.

Ад продкаў токам пачуцця,
Якім і я сагрэты,
Бяжыш ты ў новы дом жыцця,—
Хвала табе за гэта!

Зямля бацькоў, за шчодры дар—
Шапэна звонкі вырай—
Прымі ад нас, як гаспадар,
Цяпло падзякі шчырай.

За чарналескі гоман дрэў,
Дзе нашых дум калыскі,
За кожны рытм, за кожны спеў
Табе паклон мой нізкі!

За кроў тваю і боль пакут,
За ўсё, чаму вучыла,
За ўсё, што мы збудуем тут,
Хвала табе, Айчына!

За мазавецкі горды тон,
Што ў нашай мове чутны,
За шыр душы табе паклон,
О мой народ магутны!

Уладзіслаў БРАНЕЎСКІ

МАЗАВЕЦКАЯ ДАЛЬ

1.

Вершы даю вам,
як збожжа араты,
як вугаль гарняк.

Хлеб вас накорміць,
вугаль сагрэе,
а вершы?..

Зірніце:
мой акрываўлены верш,
як нованароджаны,
ўскрыкне
і ў час
радасцю прыйдзе
да вас.

Прыгожыя вершы.
Прыгожае слова жыцця.

2.

Мазавецкая даль трапяткая,
Па табе ў паняверцы
Позірк мой пасталелы блукае
І маё дзіцячае сэрца.

Бачу Бор Каралеўскі
З Тумскай гары.
Растаюць чарнаватыя ўзлескі,
Як ноч на зары.

Тлум качыны і багна...
Дзе ты, выцвілы час?
Зноў гукнуць па-дзіцячаму прагну,
Толькі рэха ў адказ.

Старэю, як дужы дуб:
Хай серабром блішчастым
Аблокі кранулі чуб.
Я паспрачаюся з часам!
Калі ж
і ўпаду
я —
Да роднай зямлі ва ўладанне,
Кроўная песня мая
Крыкам апошнім стане.

3.

Прыгожая рака,
Ты, польская рака,
Рака жыцця майго —
Дакуль плывём?
Калі ж ля твайго вусця, дзе імжа,
Маёй апошняй радасці мяжа,
Вазьмі мяне, бяссонная рака,
І вось табе сыноўняя рука,
О Вісла!

Юзаф Озга МІХАЛЬСКІ

■ ■ ■

Застануся
па-за домам,
па-за громам і агнём,
па-за морам невядомым,
па-за ноччу і днём.
Застануся заўтра я
за арбітаю зямной.

Покуль свеціць зорка мая,
Покуль смерць не палюе за мной,
Дай руку мне,
Красуня Венера!

Прывітаўшы зорнае веча,
Да цябе ідзе на сустрэчу
У чырвонай кашулі анёл—
Рускі хлопец,
грымотным абцасам
Высякаючы іскры над часам,
Абуджаючы зоры наўкол.
Агалі свае цела, планета,
Скінь уборы, пашытыя з хмар,
Будзе сэрца людское сагрэта
Зоркай спраўджаных мар.
Я з Венерай — прыручанай зоркай—
Як з прыгожай і зграбнай танцоркай,
Выйду тупаць у далях сусвету
На высокім абцасе ракеты.

ПАЎНОЧНАЯ ПАРА

Паўночная пара —
раскроены кавун,
глухія крокі неба,
дажджоў тугіяпольцы,
шматкі парваных хмар,
асколкі перуноў
і лепет лісцяў першых...

НЕ БАЧУ ТОЛЬКІ...

Магу падглядзець
зорку, што згасае,
і рыбу, закаханую да скону,
і мора, што няўтольна п'е
ракі бяздонны келіх
з крывою ножкай,
не бачу толькі
смерці часу.

Леапольд СТАФ

МАЦІ

Ля акна на змярканні
Маці гайдае нагой
Калыску, дзе спіць немаўлятка.

Але няма ўжо калыскі.
Але няма ўжо дзіцяткі.
Цені пакой засяляюць.
Маці адна на змярканні
Калыша нагой
Успаміны.

НАТХНЕННЕ

Гэта не голас святога духа,
А шторм нечаканы ў жылах;
Пульс барабанам бухае глуха,
Сэрца ўзлятае на крылах.

Схапі бліскавіцу, як шаблю да бою,
Вецер прышпораны ахне.
І рагачы, калі поруч з табою
Спознены гром бабахне.

МОСТ

Я не верыў,
Стоячы на беразе ракі,
Цёмнай і шырокай, нібы эра,
Што прайду дрыготкі мост, які
Сплецен з крохкіх жэрдак і веры.

Я ішоў так лёгка, як віхор,
І так цяжка, быццам цень
астрожны,
Я ішоў так спрытна, як танцор,
І, нібы разведчык, асцярожна.

І не верыў я, што мост прайду,
Слухаючы гулкую ваду,
І цяпер сябе не пазнаю:
Я на новым беразе стаю.

Севярын ПОЛЯК

ГУЛЬНЯ

Ну, што ж, бывай. За шыбай лёгка
З нябёсамі гуляю ў карты.
Блакіт падлічвае здалёку,
Варожыць мне, чаго я варты.

Зара абручана са змрокам,
І перш чым неба ў ноч патоне,
Дастану сваю зорку зрокам,
Убачу лёс, як на далоні.

Ахвоты да гульні ўсё меней:
Як, зоркі, васператасуюць?
І я бяру паўнюткай жменяй
Праменні, што, як кроў, пульсуюць.

І ўжо ў маёй кішэні зорка
Брынчыць — і я такі багаты.
За боль, які сплывае горка,
Нібы шукаю я адплаты.

Я зацугляў рукой зямною
Нябёсы ў пінжаку падраным.
І змрок цямнее нада мною
Самазабойцам абыграным.

Пераклаў з польскай мовы
Пятрусь МАКАЛЬ.

Чорна-белая фатаграфія не перадасць усю прыгажосць і маляўнічасць нацыянальнага касцюма. Гэтая дзяўчына — жыхарка Люблінскага ваяводства. Такія ж пацеркі разам з пучком рознакаляровых стужак носяць і кракавянкі. У многіх раёнах жаночы касцюм складаецца з расшытай безрукаўкі і ваўнянай паласатай спадніцы.

Але ёсць заўсёды нешта агульнае ў гэтых розных нацыянальных касцюмах аднаго народа. У іх адлюстраваліся тыя колеры, якія спрадвеку бачылі вакол сябе жыхары гэтых зямель: чырвоны колер маку, блакіт неба і льняной кветкі, сінь васількоў, зеляніну палёў і лясоў...

ДЗЕНЬ УЧАРАШНІ І СЁННЯШНІ

Тысячагоддзе Польскай дзяржавы. Гэта вялікае свята нашага народа, перад якім сёння разгортваецца шматвекавая панарама айчыннай гісторыі. Яно нагадвае аб лепшых патрыятычных, прагрэсіўных і рэвалюцыйных традыцыях, да якіх звяртаецца сучаснае пакаленне, што аддае ўсе свае сілы для сацыялістычнай рэканструкцыі краіны, адроджанай ў новых граніцах, з новым грамадскім ладам.

Святкаванне тысячагоддзя Польскай дзяржавы ператвараецца ў школу палітычнай сталасці і грамадзянскасці. Уваскрашаючы памяць аб выдатных падзеях айчыннай гісторыі, мы садзейнічаем масаваму распаўсюджванню творчага, актыўнага падыходу да задач сённяшняга дня, даём свайму народу, а ў першую чаргу шматмільённай арміі моладзі вартыя пераймання ўзоры думкі і справы, высокіх ідэалаў і ўзвышаных пачуццяў, мабілізуючы ўсе сілы нацыі на пабудову сацыялізма.

Разгорнутыя даследаванні і іх усебаковая папулярызацыя, з мэтай задаволіць вялікую цікавасць у краіне да айчыннай гісторыі, дазваляюць грамадскасці прасачыць гістарычны працэс, адзначаны барацьбой дзвюх плыняў — прагрэсіўнай і рэакцыйнай. Яны даюць магчымасць прыглядзецца да таго, як з пакалення ў пакаленне перадавалася эстафета патрыятычных і прагрэсіўных ідэй, як нарастаў рух, які сцэментаваў у адно цэлае задачы барацьбы за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне і ўвянчаў тысячагадовую гісторыю нацыі стварэннем народнай дзяржавы.

Дваццаць два гады наш народ удзельнічае ў будаўніцтве новай Польшчы. Наша будучыня неаддзельная ад новага сацыялістычнага свету, народжанага ў дні Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. У лагеры брацкіх сацыялістычных краін новая Польшча навекі пазбылася пагрозы з боку германскай рэакцыі, германскага мілітарызму, якая вісела над ёю на працягу тысячы гадоў. У той жа час новая Польшча стала важным фактарам новых суадносін сіл, актыўнай удзельніцай міжнароднай барацьбы супраць імперыялізму, за свабоду, прагрэс і мір.

Дасягнутыя поспехі мы вымяраем сёння тысячамі новых буйных прамысловых прадпрыемстваў. Народная Польшча з году ў год памнажае свае прадукцыйныя сілы і ўдасканальвае сацыялістычныя рычагі сваёй эканомікі, дзякуючы чаму сістэматычна скарачаецца дыстанцыя, якая аддзяляе краіну ад найбольш развітых у гаспадарчых адносінах еўрапейскіх краін.

У 1965 годзе была завершана чарговая пяцігодка. Да яе пачатку прамысловая вытворчасць Польшчы ў дзесяць разоў перавысіла ўзровень даваеннага 1938 года. На працягу апошніх пяці гадоў тэмпы гадавога прыросту прамысловай прадукцыі былі ў сярэднім удвая вышэйшыя, чым у краінах Заходняй Еўропы. За гэты перыяд прамысловая вытворчасць павялічылася прыкладна на 52 працэнты.

Эканамічнае развіццё краіны суправаджаецца глыбокімі структурнымі зменамі. Да вайны, ва ўмовах перанасялення вёскі і пастаяннага аграрнага крызісу, дзве трэці насельніцтва чэрпалі сродкі да існавання ў сельскай гаспадарцы. А цяпер, наадварот, — дзве трэці насельніцтва краіны заняты не ў сельскай гаспадарцы. У бліжэйшыя месяцы колькасць гарадскога і сельскага насельніцтва зраўняецца.

Пабудова больш тысячы школ у якасці помнікаў тысячагоддзя складае толькі частку шырокай панарамы культурнай рэвалюцыі, якая здзяйсняецца ў Польшчы.

Пры народнай уладзе ажыццяўляецца ідэйны запавет барацьбітоў за адукаваную, культурную Польшу, якая адкрывае шырокія шляхі да развіцця і вяршынь ведаў перад усёй моладдзю. У краіне налічваецца сёння 76 вышэйшых навучальных устаноў. Сярод студэнтаў, колькасць якіх у параўнанні з даваенным павялічылася ў восем разоў, палавіну складае моладзь з рабочых і сялянскіх сем'яў. За дваццаць гадоў народнай Польшчы выраслі сотні тысяч высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія працуюць сёння ва ўсіх галінах гаспадаркі і культуры.

Польшча ганарыцца сваімі шматвяковымі традыцыямі ў галіне навукі і культуры. У Кракаве ўзнік адзін з першых у свеце універсітэтаў. Польская навуковая і мастацкая літаратура ўваходзіць сваімі карэннямі ў глыбокую старажытнасць. Імёны Каперніка, Марыі Кюры-Складоўскай, Міцкевіча і Шапэна вядомыя ўсяму чалавецтву. Аднак у краіне, «урадлівай на таленты», паводле слоў вялікага польскага паэта Юліуша Славацкага, не было ўмоў для развіцця народа і многіх яго таленавітых сыноў. У той самай Польшчы, у бібліятэках якой захоўваліся кнігі, напісаныя ў XIII стагоддзі, да вайны налічвалася звыш шасці мільёнаў непісьменных. У многіх раёнах буржуазнай Польшчы адно месца ў апошнім класе сярэдняй школы прыпадала на сем-восем тысяч маладых людзей адпаведнага ўзросту.

Цяпер у нашай краіне ажыццяўляецца буйнейшая рэформа сістэмы народнай асветы, у выніку якой у бліжэйшыя гады будзе ажыццёўлены пераход да ўсеагульнай абавязковай васьмігадовай адукацыі, а праз восем-дзесяць гадоў моладзь зможа пасля заканчэння восьмага класа працягваць вучобу. Гэта будзе якасны скачок у школьнай справе. Але ўжо цяпер мы маем права ганарыцца тым, што ў галіне адукацыі Польшча абагнала многія еўрапейскія краіны. Вось чаму так аднадушна ўся наша грамадскасць працягвае збор добраахвотных узносаў на школьнае будаўніцтва пад новым дэвізам: «Увесь народ — сваёй моладзі».

Народная Польшча з'яўляецца вянцом усёй папярэдняй гісторыі польскага народа і Польскай дзяржавы, яна здзяйсняе мары лепшых людзей у гісторыі польскай нацыі.

На парозе другога тысячагоддзя польскай гісторыі праца ў імя мірнай будучыні нашай краіны і яе росквіту надае глыбокі ідэйны сэнс нашым штодзённым справам, звязвае намаганні польскага народа ў адно з намаганнямі ўсіх народаў сацыялістычнай сістэмы і імкненнямі людзей добрай волі ва ўсім свеце.

Ян ЖАРНІЦКІ,
польскі публіцыст.

ПАСКОРАНЫ РЫТМ ЖЫЦЦЯ

За дваццаць два гады існавання Польскай Народнай Рэспублікі ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі і сацыялістычнай культуры адбыліся зрухі, які першы сакратар ЦК ПАРП Уладзіслаў Гамулка ахарактарызаваў, як «паскарэнне рытму сэрца народа».

Вызначэнне вельмі трапнае, бо гэтае сэрца, яшчэ нядаўна стомленае нягодамі, цяпер б'ецца ўпэўнена. Аб яго паскораным рытме сведчаць шматлікія лічбы і факты. Вось некаторыя з іх.

ТОЛЬКІ ў 74 інстытутах і акадэміях Польшчы набываюць веды больш двухсот тысяч студэнтаў. Гэтыя лічбы будуць яшчэ больш пераканаўчымі, калі параўнаць колькасць студэнтаў на дзесяць тысяч жыхароў краіны: год 1938—14, 1966—64. Для параўнання можна прывесці даддзеныя з найбольш развітых капіталістычных краін, дзе на такую ж колькасць жыхароў прыпадае: у Францыі—62, Аўстрыі—60, Галандыі—58, Швейцарыі—43, ФРГ—47, Англіі і Даніі—40, Італіі—35, у Іспаніі—26 студэнтаў.

У ПНР працуе звыш трыццаці выдавецтваў, якія штогод выпускаюць звыш 80 мільёнаў экземпляраў кніг. Мерай дасягненняў у гэтай галіне могуць служыць пасляваенныя тыражы твораў польскіх класікаў: Міцкевіча—6,5 мільёна, Славацкага—3,5, Сянкевіча—каля 12, Пруса, Канапніцкай, Крашэўскага — больш як па 10 млн., Жаромскага — 6,5 мільёна экземпляраў. Больш як па мільёну экземпляраў выдадзена твораў Талстога, Дзікенса, Бальзака, Чэхава, Пушкіна, Стэндаля, Гюго, Заля, Твэна.

Польская літаратура карыстаецца вялікім попытам і за рубяжом. За перыяд 1945—1966 гадоў выйшла звыш 2600 выданняў польскай літаратуры ў перакладзе на 60 моў свету.

120 ПОЛЬСКІХ музычных і тэатральных калектываў — перш-наперш «Мазоўшэ», «Шлёнск», аркестр Нацыянальнай філармоніі — за 22 гады правялі каля паўтысячы турнэ за межамі Польшчы. За гэты ж час за мяжой выступіла амаль столькі ж салістаў. Польскія кампазітары і выканаўцы атрымалі звыш 200 прэмій і дыпломаў. Польшча—адзін з сусветных музычных цэнтраў. Тут праводзяцца Міжнародны фестываль сучаснай музыкі «Варшаўская восень», Міжнародны конкурс піяністаў імя Фрэдэрыка Шапэна, Міжнародны конкурс скрыпачоў імя Генрыка Вяняўскага, фестывалі песні ў Сопаце і інш.

ПАСЛЯ вайны польскія кінафільмы атрымалі на фестывалях каля 400 узнагарод. Міжнародная крытыка падкрэслівае артыстычныя і ідэйныя якасці «польскай кінашколы». За дваццацігоддзе палякі прадалі 2800 кінастужак у 60 краін свету.

12,5 МІЛЬЁНА палякаў садзяцца кожны вечар каля тэлевізараў. Цікавыя і разнастайныя праграмы, лекцыі і парады, музычныя перадачы і віктарыны, крытычныя агляды і артыкулы ў друку набліжаюць тэлевізійныя і радыёстудыі да масавага гледача і слухача.

Польскае радыё супрацоўнічае са 108 радыёстанцыямі з 57 краін свету і 8 арганізацыямі падобнага тыпу; прымае актыўны ўдзел у працах АІРТ, ЮНЕСКА, Міжнародным савеце па народнай музыцы і Міжнародным радыёўніверсітэце. Толькі ад замежных слухачоў Польскае радыё атрымлівае штогод некалькі дзесяткаў тысяч пісьмаў.

ПАЛЯКІ любяць і шануюць помнікі старадаўнасці. З захаваннем першапачатковага выгляду адбудаваны ўсе старадаўнія будынкі ў Варшаве, Вроцлаве, Гданьску і іншых гарадах, разбураных вайной.

У гарадах Польшчы ёсць многа прыгожых і сучасных будынкаў. Польскія дойліды прымаюць актыўны ўдзел у конкурсах на лепшыя праекты помнікаў, будоўляў не толькі сваіх, але і замежных. Між іншым, яны атрымалі ўзнагароды ў конкурсах на праекты забудовы цэнтра Сафіі і Тэль-Авіва, штучнага вострава Транчэта побач з Венецыяй, універсітэцкага гарадка ў Дубліне, за праекты новай забудовы Скопле і тэатра ў Новым Садзе (Югаславія) і г. д.

Варшава. Тэатральная плошча. Перамаганосная Ніке — помнік героям-варшавянам.

КУЛЬТУРНАЯ МАЗАІКА



Вядома, цяжка знайсці цяпер у вясковых дамах, крытых бляхай або чарапіцай, такія святліцы, як гэтая на фотаздымку. Гэта па сутнасці музей лавічанскага мастацтва (Лодзінскае ваяводства). Мастацкія падвескі з саломы і папяроснай паперы яшчэ часта красуюцца па суседству з электрычнымі свяцільнікамі. А матывы народнай мэблі—крэслаў, куфраў і ложкаў—усё часцей выкарыстоўваюцца [illegible] сучаснай фабрычнай мэблі

ПРА IX загава[...]
чатыры назад[...]
якая склалася з два[...]
ці польскіх маста[...]
здзівіла свет прагр[...]
вага «ізму». Проста[...]
ноўвала адно агул[...]
ненне: паказаць пр[...]
карціну рэчаіснасці[...]
мастакоў гэтай груп[...]
нічога агульнага з[...]
фаваннем рэчаісна[...]
туралістычным к[...]
нем яе. Глыбока[...]
альнае бачанне св[...]
зам з тым пошукі[...]
тыўнага аблічча,[...]
суб'ектыўнасць[...]
стылю, якая сп[...]
халодны назір[...]
яснасцю думкі,[...]
ад барочнай пр[...]
вось што падно[...]
па польскіх рэалі[...]

На IV выстаўц[...]
таў, якая адбылас[...]
было паказана зві[...]
бот 33 мастакоў[...]
групу з якіх ск[...]
ладзь. Гэта, зра[...]
білася на хара[...]
стаўкі — узбага[...]
вымі фармальны[...]
тычнымі пошука[...]
карцінамі ветэр[...]
скага рэалістычн[...]
су — Елены і К[...]
еўскіх і мужа і[...]
саў — тут былі[...]
ладых, але ўжо[...]
домых у краіне[...]
Бянона Ліберс[...]
Краўчыка, Гані[...]
Грундланд і інш[...]
экспрэсіі кампа[...]
Маркоўскай, у я[...]
жаюць цёмныя а[...]
бока лірычныя п[...]
фала Паморскага[...]
старых гарадскіх[...]
на карцінах Юзэф[...]
скага суіснуюць[...]
мі, залітымі сонца[...]
жамі Рышарда[...]
цудоўнымі кам[...]
Барбары Шайдзін[...]
чык.

Асаблівай увагі[...]
ваюць палотны[...]
Стальмашэўскай -[...]
Уладзімежа Панас[...]
ныя ў прыроду, як[...]
юць яе зменлівасц[...]
ажурных формах,[...]
каляровай гамай.

IV выстаўка гру[...]
стаў—працяг трад[...]
спынная дыскусія[...]
лым, у гарніле я[...]
джаецца мастацт[...]
няга дня — маста[...]
му неўласцівыя[...]
акадэмічная косн[...]
стацтва, кроўна[...]
сучаснасцю.

У ПОЛЬШЧЫ[...]
ца каля 40[...]
тэатраў паэзіі.[...]
гады наладжва[...]
польскія фесты[...]
тэатраў, якія зас[...]
лікую папулярна[...]

Сёлетні вясн[...]
ны чарговы фес[...]
будзе працягва[...]
год. З выпадку[...]
Вялікага Кастры[...]
стываль будзе[...]
ў асноўным рус[...]
кай паэзіі.

Фестываль па[...]
два этапы. Спа[...]
дуцца ваяводс[...]
паэзіі, а потым[...]
будзе наладжан[...]
агляд. Перамож[...]
каштоўныя ўз[...]
прэміі, у прыва[...]
ездка ў СССР.

Кракаў. Помнік Адаму Міцкевічу.

КРАКАЎ—ГОРАД ЛЕГЕНД

КРАКАЎ ганарыцца легендамі. Ён робіць гэта, усяляючы глыбокую пашану да цудаў сваёй архітэктуры, помнікаў нацыянальнай культуры, пераканаўчых сведкаў яе старажытнага характару. Ён ахвотна малюе перад уяўленнем палякаў карціны, якія найбольш ярка ў ім адлюстроўваюцца, нягледзячы на тое, што вучоны можа ставіць пад сумненне праўдзівасць некаторых фактаў. З гэтай скалы польская княжна кінулася ў ваду, бо не хацела выходзіць замуж за немца; а тут хітры шавец, дзякуючы сваёй хітрасці, выратаваў горад ад дракона; а ў гэтым доме гуляе начамі белая здань, што не перашкаджае ўдзень работнікам гарадскога савета вырашаць тут неадкладныя справы горада.

Прыезджы чалавек адразу ў Кракаве трапляе ў палон легенд. Ён ахвотна ходзіць па слядах сапраўднай гісторыі, якая абавязкова прывядзе яго на Вавельскі курган. Тут хадзілі паслы, якія прыязджалі да двара польскіх магнатаў, тут прыязджалі каралеўскія сваты, якія раднілі кіруючыя дынастыі Еўропы. На гэтым кургане зараджаліся і цярпелі няўдачы вялікія палітычныя задумы, сюды прыязджаў Ягела, каб атрымаць жонку і заключыць унію паміж дзвюма дзяржавамі. Тут выспявалі светлыя ідэі польскага Адраджэння, якія падтрымала мудрая каралева Ядвіга, ахвяраваўшы свае ўласныя каштоўнасці на рэканструкцыю Кракаўскага універсітэта.

Кракаў, хоць і заняты сёння прозаю штодзённага жыцця, усведамляе сваю веліч і нібы жартам нагадвае, што сталіцаю ён ніколі не перастаў быць, бо кароль Сігізмунд III Ваза тайком і неафіцыйна ў канцы XVI стагоддзя перапраўіў сям'ю і двор у Варшаву, а змена адраса — няхай нават каралеўскага—яшчэ не сведчыць аб змене сталіцы. А калі гаворка зойдзе аб метрыцы сталіцы—калі ласка, можаце агледзець за невялікую плату грабніцы каралеўскай дынастыі ў падзямеллях кафедральнага сабора. На абед жа—калі ласка, да Вежэнека, дзе кракаўскі мешчанін у XIV стагоддзі наладзіў для еўрапейскіх каралёў банкет над банкетамі.

А калі да таго ж з вежы Мар'яцкага касцёла паплыве сігнал трубача і разнясецца па горадзе, над гандлёвым пасажам, які называецца Сукянніцы, над стракатымі радамі кветачніц на рынкавай плошчы, ведаеш ужо з усёй упэўненасцю—Кракаў адзіны і непаўторны, як каштоўная жамчужына ў кароне гісторыі. І няхай іншыя гарады Польшчы апярэдзілі яго сучаснасцю, ён ні каліва не страціў сваёй вартасці.

Кракаў палюбіўся легендам. Аднак ім станавілася цесна ў самім горадзе. Сучасная легенда пасялілася ў вёсцы Магіла. Магіла — гэта назва, вартая, бадай, для сімвалу. Зрэшты, не толькі назва. Гэта сярмяжная падкракаўская вёска атрымала шанцы праславіцца на ўсю Еўропу. Бо там пачалася сучасная легенда Новай Гуты. Таму, хто прыязджае цяпер у гэты горад, які налічвае больш 120 тысяч жыхароў, цяжка паверыць, якім быў яго першы дзень. Калі рабочы пасёлак А-І, які не атрымаў яшчэ тады ніякай гучнай назвы, пачынаў жыць уласным жыццём, калі выраслі першыя дамы на першых вуліцах, не спыняліся размовы, што ўся гэта задума—справа рызыкоўная.

Сёння Новая Гута мае 65 тысяч жылых пакояў (зразумела, новых), 133 сацыяльныя аб'екты, 90 кіламетраў новага бруку, 6 трамвайных ліній, 10 аўтобусных ліній, 40 тысяч тэлефонных абанентаў. Штодзённа на металургічны камбінат імя Леніна прыходзіць 25 тысяч рабочых, тэхнікаў, інжынераў.

Легендам палюбіўся Кракаў. Некаторыя новыя легенды ўпарта сцвярджаюць: статычны, сонны горад, горад, які ідзе на спачын, як толькі на бульварным кальцы Плянты запаляцца ліхтары, горад, які не расце, а тым часам аказваецца, што напярэдадні вайны Кракаў налічваў усяго толькі 259 тысяч жыхароў, у снежні 1965 года—520 тысяч, дэмаграфічны ж прагноз на 1980 год прадугледжвае 700 тысяч. Тут II вышэйшых навучальных устаноў, каля 27 тысяч студэнтаў, звыш 27 тысяч выпускнікоў вну за мінулае дзесяцігоддзе. У падкракаўскай вёсцы Бранавіцы знаходзіцца цэнтр самай сучаснай навуковай і тэхнічнай думкі — Інстытут ядзерных даследаванняў.

Штодзённа з аўтобусаў і паяздоў высаджваецца ў Кракаве 40 тысяч чалавек. Горад дае ім работу, але не можа яшчэ даць кватэр. Кіраўнікі горада гавораць: цяпер у нас прыпадае 1,63 чалавека на адзін пакой. І шукаюць на плане горада месца пад новае будаўніцтва. Кіраўнікі горада дадаюць: каб Кракаў выканаў праграму, намечаную на 1980 год, ён павінен выйсці з Кракава. І ён выходзіць—выходзіць не толькі за межы старых, крапасных сцен старажытнага «града», выходзіць таксама за межы ўсталяваных звычак, традыцый, легенд.

□ □ □

Калі турыст пройдзе праз Фларыянскія вароты да рынкавай плошчы, з усіх бакоў яго акружаюць галубы, назойлівыя, неадчэпныя. Як гаворыць легенда—гэта дружына князя Генрыка Пробуса, якому фея дала золата, каб ён прывёз карону з Рыма. Князь растраціў золата, кароны не прывёз і ў пакаранне быў ператвораны разам са сваёй дружынаю ў галубоў... Пробусаўскіх галубоў кормяць жыхары сённяшняга Кракава і незлічоныя натоўпы турыстаў.

Барбара СІДАРЧУК,
польская журналістка.

ПРЫЯЗНЬ ДАЎНЯЯ І ШЧЫРАЯ

ЛІТАРАТУРНЫ АГЛЯД

У апошні час польскія пісьменнікі і вучоныя ўсё больш і больш цікавяцца мінулым і сучасным Беларусі. У выніку з'явілася нямала кніг і артыкулаў у часопісах, прысвечаных розным праяўленням векавой дружбы двух братніх народаў. Некаторыя з гэтых публікацый маюць вялікую цікавасць і для беларускага чытача.

Свой агляд твораў нашых польскіх сяброў мне хацелася б пачаць з кнігі мемуараў пісьменніцы і грамадскай дзеячкі АННЫ ЕНДРЫХОЎСКАЙ «ЗІГЗАГАМ І ПРОСТА» (Варшава, 1965). Яе аўтар — жонка вядомага дзяржаўнага дзеяча Стэфана Ендрыхоўскага — у 30-я гады і ў час фашысцкай акупацыі жыла ў шматнацыянальнай Вільні, якая тады з'яўлялася цэнтрам заходнебеларускага вызваленчага руху. А. Ендрыхоўская сама знаходзілася ў гушчыні гэтага руху і таму з добрай дасведчанасцю піша і пра суд над «Грамадой», і пра выступл С. Прытыцкага ў правакатара Стральчука, і пра сувязі КПЗБ з перадавымі коламі польскай інтэлігенцыі, і пра ўдзел М. Танка ў выданні прагрэсіўнага часопіса «Папросту». З цеплынёй і сардэчнасцю гаворыць пісьменніца пра народныя масы Заходняй Беларусі, якія, беручы прыклад з суседняй Савецкай Беларусі, «усімі сіламі сваіх самых лепшых людзей імкнуліся да развіцця ўласнай культуры і незалежнасці».

Найбольш усхваляваныя старонкі кнігі «Зігзагам і проста» прысвечаны кіраўнікам віленскіх маладзёжных арганізацый Генрыку Дэмбінскаму і Стэфану Ендрыхоўскаму. Іх шлях да камуністычнай ідэалогіі ішоў не проста, а «зігзагам», Генрык Дэмбінскі спачатку быў перакананым католікам. Прыбыўшы пасля заканчэння Ашмянскай гімназіі ў Вільню, ён стаў адным з лідэраў легальнага «Адраджэння». Але знаёмства з «Капіталам» Маркса, з матэрыяламі працэсу над «Грамадой» многае змяніла ў светапоглядзе Дэмбінскага. Ён выйшаў з «Адраджэння» і, па сутнасці, узначаліў саюз левай моладзі Віленскага універсітэта «Фронт». Праз Андрэя Навіцкага гэта арганізацыя была цесна звязана з КПЗБ. У 1935 годзе мясцовыя ўлады прыцягнулі кіраўніцтва «Фронту» — 6 палякаў, 3 беларусаў, літоўца і яўрэя — да судовай адказнасці, а самую арганізацыю распусцілі.

Аднак Г. Дэмбінскі і яго сябры не склалі зброю. Неўзабаве яны сталі выдаваць літаратурна-грамадскі часопіс «Папросту», які здабыў вялікую папулярнасць у беларускіх гарадах і сёлах. Беларускі аддзел часопіса рэдкалегія даверыла Максіму Танку. На старонках «Папросту» Дэмбінскі, Ендрыхоўскі, Путрамант і інш. выступалі ў абарону працоўных Заходняй Беларусі. Так, Е. Путрамант змясціў тут вядомы рэпартаж «Ардаль» змагаецца», прысвечаны забастовачнай барацьбе лідскага пралетарыята. Праз некаторы час «Папросту» быў забаронены, а яго вядучыя супрацоўнікі апынуліся на лаве падсудных. Выступаючы на працэсе, Дэмбінскі заявіў: «Польская традыцыя барацьбы за нашу і вашу свабоду сёння павінна абавязваць нас да абароны поўнага раўнапраўя і культурнага развіцця беларусаў і ўкраінцаў».

Паслядоўны інтэрнацыяналіст Г. Дэмбінскі з энтузіязмам сустрэў устанаўленне Савецкай улады ў Заходняй Беларусі. Ён пачаў працаваць на ніве народнай асветы ў Ганцавіцкім раёне. У 1941 годзе фашысцкія акупанты арыштавалі яго. Вясковы хлапчук, які быў пры расстрэле Дэмбінскага, запомніў яго апошнія словы: «Я іду на смерць, таму што вельмі люблю людзей». Гэтыя словы потым перадавалі з вуснаў у вусны беларускія сяляне.

Побач з Дэмбінскім і Ендрыхоўскім са старонак кнігі паўстаюць вобразы іх польскіх, беларускіх і літоўскіх паплечнікаў і аднадумцаў. Гэта — выдатны біёлаг, партызанскі ўрач Казік Петрусэвіч, сын удзельніка I з'езда РСДРП, вядомага адваката, які ў свой час абараняў Я. Коласа. Гэта — беларускія падпольшчыкі Мікола Урбановіч, Марцін Шчэкала і Аляксандр Смаль, якія пасля працэсу над групай «Папросту» прайшлі праз жахі канцлагера ў Бярозе. Гэта — ксёндз Глябовіч, расстраляны фашыстамі непадалёку ад Барысава. Урэшце, гэта — светлавалосая партызанская сувязная Маша, якая прыходзіла ў акупіраваную Вільню ад групы нарачанскіх атрадаў. Для кожнага са сваіх герояў пісьменніца знаходзіць цёплае слова, трапную характарыстыку.

Неаднаразова А. Ендрыхоўская прыгадвае таксама імя беларускага паэта і падпольшчыка Максіма Танка, талент якога яна называе «вялікім і арыгінальным». У час працэсу над групай «Папросту» Танк вельмі хваляваўся за лёс сваіх сяброў і радаваўся, калі большасць з іх аказалася на волі. «У той жа дзень, — піша Ендрыхоўская,— прыйшла да нас дэлегацыя беларусаў. Сярод іх знаходзіўся Максім Танк. Максім ведаў, што такое турма. Часта вечарам ён наведваў Путраманта. Чытаў свае вершы. Неаднаразова, прысеўшы на тапчане, слухаючы яго дэкламацыю, я ўпівалася прыгажосцю беларускай мовы. Некаторыя лічаць яе грубаватай. Гэта няпраўда. Яна мае пах чорнага хлеба і цяпло змораных рабочых рук. Часта я прасіла Максіма прачытаць верш «Цягнікі». Да вёсак імчалі паравозы з вогненнымі грывамі і вызвоньвалі па рэйках новую песню. Віталі яе дзяўчаты, жнеі, вясковыя музыкі і паэты. «І яны, і мы,— думала я,— разам чакаем з'яўлення новай песні».

У адрозненне ад кнігі Анны Ендрыхоўскай, якая абапіралася пераважна на ўласныя ўспаміны, праца АНДЖЭЯ СЛІША «ПОЛЬСКІ ДРУК У БЕЛАРУСІ ДА 1921 ГОДА», змешчаная ў V томе «Штогодніка гісторыі польскай журналістыкі» (Варшава, 1966), пабудавана на архіўных матэрыялах і дакументах. Яны дапамаглі аўтару раскрыць адну з цікавейшых і амаль зусім невядомых дагэтуль старонак у гісторыі развіцця марксісцкага друку на тэрыторыі Беларусі. Асаблівую ўвагу Сліш звяртае на газету «Праўда», якая пачала выходзіць на польскай мове ў Мінску пасля перамогі Кастрычніка (з 15 снежня 1917 г. газета стала называцца «Польска Праўда»). Побач са Станіславам Берсанам і Стэфанам Янкоўскім адным з рэдактараў гэтага выдання быў выдатны польскі рэвалюцыянер Стэфан Гельтман, які пасля стаў наркомам земляробства БССР, а з 1925 г.— рэктарам Камуністычнага універсітэта ў Мінску. «Праўда» шырока прапагандавала ідэі Кастрычніка, заклікала да супрацоўніцтва з рускім пралетарыятам, да барацьбы за сацыялістычную Польшчу. Газета вяла вострую палеміку з правымі польскімі выданнямі, якія друкаваліся тады ў Мінску. («Пляцуўка» і інш). Традыцыі «Праўды» пераняла штодзённая рабочая газета «Млот», першы нумар якой выйшаў у Мінску 18 снежня 1918 г. 3 лютага 1921 г. «Млот» стаў органам Польскага бюро пры ЦК КП(б)Б.

Значную навуковую каштоўнасць маюць таксама прыведзеныя А. Слішам звесткі пра такія польскія перыядычныя выданні, як «Газэта тымчасова Міньска» (1812), «Месенчнік Полоцкі» (1818—1820), «Гвязда заранна» (1908), «Погонь» (1915—1917), «Дзённік Міньскі» (1917—1918), «Антыхрыст» (1917—1918) і інш. Характарызуючы іх, даследчык заўсёды дакладна вызначае іх грамадскае аблічча, ідэйную накіраванасць. Праца А. Сліша, у якой гаворыцца аб польскіх газетах і часопісах, народжаных Кастрычнікам у Беларусі, мае асаблівую каштоўнасць напярэдадні 50-годдзя Савецкай улады, таму што паказвае адзін з момантаў барацьбы за гэту ўладу.

Больш аддалены гістарычны перыяд стаў аб'ектам даследавання ў кнізе ДАВІДА ФАЙНГАУЗА «КАНСПІРАЦЫЙНЫ РУХ У ЛІТВЕ І БЕЛАРУСІ У 1846—1848 ГАДАХ». (Варшава, 1965). Аўтар уводзіць у навуковы ўжытак многія невядомыя дагэтуль матэрыялы, якія захоўваюцца ў савецкіх і польскіх архівах. У працы скрупулёзна прасочваюцца шматлікія сувязі паміж рознымі эмігранцкімі арганізацыямі і нелегальнымі аб'яднаннямі на тэрыторыі Літвы і Беларусі, даюцца поўныя спісы членаў гэтых аб'яднанняў.

Кніга Д. Файнгаўза пачынаецца раздзелам, у якім ахарактарызавана грамадска-палітычнае жыццё ў Літве і Беларусі ў сярэдзіне мінулага стагоддзя.

Д. Файнгаўз аналізуе ўплыў, які аказалі на развіццё беларускай і літоўскай літаратур польскія рамантыкі. У сувязі з гэтым называюцца імёны Дуніна-Марцінкевіча, Багрыма, Сыракомлі, Даўкантаса, пералічваюцца публікацыі беларускага фальклору. Шкада толькі, што пры гэтым аўтар дапускае некалькі недакладнасцей. Ф. Тапчэўскага ён залічае да пісьменнікаў першай паловы XIX ст., называе беларускім польскага паэта А. Пяньковіча і інш. Незразумела таксама, аб ліквідацыі якіх беларускіх парафіяльных школ ідзе гаворка на стар. 26. Наколькі вядома, у першай палове XIX ст. такія школы не існавалі.

Найбольш багаты новым фактычным матэрыялам раздзел кнігі Д. Файнгаўза, дзе гаворка ідзе пра водгукі ў Літве і Беларусі на рэвалюцыю 1848 года ў Еўропе. Менавіта тады ўзнік тайны Саюз братняй літоўскай моладзі, на чале якога сталі ўраджэнцы Лідскага павета браты Далеўскія. Праз агентаў гэты саюз устанавіў сувязі з нелегальным згуртаваннем мінскай моладзі пад кіраўніцтвам Міхала Бокія. Па-новаму дазваляць глянуць на развіццё рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху ў Беларусі апублікаваныя Д. Файнгаўзам «Адозва да смаргонскіх сялян» і «Адозва да інтэлігенцыі». Аўтарам іх быў страсны рэвалюцыянер Юльян Бакшанскі. У сярэдзіне саракавых гадоў гэтыя адозвы аказалі прыкметны ўплыў на рост самасвядомасці беларускага сялянства.

Багатае фактамі, хоць і спрэчнае ў некаторых вывадах, даследаванне Д. Файнгаўза дапаўняе працы беларускіх гісторыкаў, прысвечаныя развіццю грамадскага руху ў Беларусі ў першай палове XIX ст.

Па сваёй тэматыцы з кнігай Д. Файнгаўза ў многім пераклікаецца артыкул МСЦІСЛАВА АЛЯХНОВІЧА «БЕЛАРУСКІЯ ЭЛЕМЕНТЫ У ПОЛЬСКАЙ ПЕСНІ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX СТАГОДДЗЯ», апублікаваны ў «Навуковых сшытках Лодзінскага універсітэта» (СШ. 43. 1966). Даўні сябра Беларусі праф. М. Аляхновіч на гэты раз даследуе ўплыў, які аказала беларуская народная песня на творчасць многіх кампазітараў і паэтаў мінулага стагоддзя. Першым кампазітарам, які засноўваў свае мелодыі на матывах беларускіх песень, з'явіўся філамат Тамаш Зан. Знаходзячыся ў турме, яго паплечнік Ян Чачот склаў і сам выконваў беларускую песню, у якой былі словы:

Да лятуць, лятуць, да дзікія гусі,
Да нас павязуць да далёкай Русі.

Пазней да 19 песень на словы Я. Чачота напісаў музыку выдатны польскі кампазітар С. Манюшка. У артыкуле цытуецца перапіска кампазітара з беларускім паэтам. Апрача таго, М. Аляхновіч разглядае музычныя творы А. Абрамовіча, Ф. Лапатынскага і В. Клімовіча, напісаныя імі на тэксты Баршчэўскага, Сыракомлі і Каратынскага. Даследчык прыходзіць да заключэння, што ўплыў беларускай народнай песні на польскую паэзію і музыку быў шматбаковы і плённы.

Урэшце, гаворачы аб польскіх публікацыях, прысвечаных Беларусі, нельга абысці ўвагай грунтоўны артыкул АНДЖЭЯ МАРКЕВІЧА «ПОЛЬСКА-БЕЛАРУСКІЯ КУЛЬТУРНЫЯ ЗБЛІЖЭННІ НА ПРАЦЯГУ СТАГОДДЗЯЎ» («Пшыязнь», 1966, № 22). Разгледзеўшы найбольш яскравыя праяўленні культурных сувязей паміж абодвума народамі ў дакастрычніцкі перыяд, аўтар падкрэслівае, што найбольш арганічны характар гэтыя сувязі набылі ў апошні час, калі свабодныя беларускі і польскі народы поплеч ідуць да адзінай мэты.

Адам МАЛЬДЗІС.



Анатоль АРЦІМОВІЧ. «Юнацтва». (З дыпломных работ выпускнікоў Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута).

ХАРАКТАР «ВЫЗНАЧАЕ» МАШЫНА

Які ў вас характар? І ці ведаеце вы яго самі? Не? Тады звярніцеся да невялікай скрынкі, на вечку якой відаць шаснаццаць рычажкоў. Вам трэба толькі перасунуць гэтыя рычажкі ўверх або ўніз, шчыра адказаць на пытанні, напісаныя ля рычажкоў: «Ці любіш ты гаварыць пра сябе?», «Ці часта звяртаешся па параду?» і г. д.

Пасля гэтага трэба націснуць кнопку, і там, дзе загарыцца лямпачка, вы прачытаеце кароткую, але выразную атэстацыю вашага характару.

Электронная машына можа сказаць вам, што вы «ўпарты, працавіты, сціплы, але не таварыскі», або, наадварот, «самаўпэўнены і хвалько». І дасць гэты аказ электронная тэхніка не на манер варажбіткі, а грунтуючыся на аб'ектыўных дадзеных псіхалагічнай навукі.

Электронны «вызначальнік характару» сканструяваны і пабудаваны за чатыры тыдні вучнем прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча горада Юрузані, на Паўднёвым Урале, Колем Рагожнікавым. Яго машына цяпер дэманструецца на выстаўцы тэхнічнай творчасці выхаванцаў вучылішча і прыцягвае да сябе ўвагу наведвальнікаў.

АДН.

ГІСТОРЫЯ СТАНОВІЦЦА ВІДАВОЧНАЙ

Перабіраючы фонды Яраслаўскага музея, даследчыкі-масквічы знайшлі закураную і брудную дошку, на якой быў напісаны абраз. Па ўсіх адзнаках дошка налічвала не адну сотню год. Знаходку адвезлі ў Маскву, у Цэнтральную мастацка-рэстаўрацыйную майстэрню.

Як дабрацца да непаўторнага жывапіснага твора, напісанага, дапусцім, у XVI стагоддзі, калі на той жа старажытнай дошцы мастакі наклалі некалькі пластоў фарбы, якія перамяжоўваюцца з грунтоўкаю?

Рэстаўратары спачатку вызначаюць узрост самага ніжняга пласта па дошцы. Потым яны пачаргова здымаюць усё, што знаходзіцца зверху, пакуль не дабяруцца да самага галоўнага.

Гадоў дваццаць назад галоўным інструментам для гэтага быў скальпель. Майстар старанна і вельмі марудна (на рэстаўрацыю некаторых абразоў траціліся гады) здымаў усё, што перашкаджала ўбачыць выдатны твор.

Нельга не захапляцца настойлівай працай старых майстроў, улюбёных у сваю прафесію. Яны ўжывалі і хімічныя рэчывы, воцатную кіслату, вінны або нашатырны спірт. Ім было няўцям, што спірты і воцат могуць уступаць у хімічную рэакцыю, напрыклад, з солямі медзі, якія ўваходзяць у склад многіх фарбаў. З-за гэтага мяняўся колер і рабіліся цьмяныя фарбы. Пад уплывам хімічных рэчываў, неасцярожна ўведзеных у фарбавы пласт, разбураліся сувязныя бялковыя рэчывы, фарбы пачыналі асыпацца. Бывала, што часткова прападалі цудоўна накладзеныя цені, найтанчэйшыя залатыя штрыхі, найдрабнейшыя дэталі і надпісы. Мастакоў-рэстаўратараў, якія прыступалі да раскрыцця старажытнага тэмпернага жывапісу, нярэдка ахоплівала роспач.

Многія рускія вучоныя, якія даражылі спадчынай продкаў, разумелі, што хімічная навука павінна адыграць велізарную ролю ў захаванні унікальных помнікаў культуры. Але толькі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Маскве была арганізавана мастацка-лабараторная секцыя. Яна працавала пры Інстытуце гісторыка-мастацкіх даследаванняў і музеязнаўства Акадэміі гісторыі матэрыяльнай культуры.

Ужо тады, звыш сарака гадоў назад, вучоныя разам з мастацтвазнаўцамі, мастакамі, гісторыкамі і рэстаўратарамі шукалі шляхі для стварэння растваральнікаў пакоставай і лакавай плёнак, якія не ўступаюць у хімічную рэакцыю з фарбамі і элементамі грунту.

Цяпер такія растваральнікі ёсць. Хімікі, сярод якіх важная роля належыць доктару хімічных навук прафесару Алене Трасцянскай, распрацавалі метады ўмацавання старажытных дошак, разбураных часам, узброілі рэстаўратараў хімічнымі саставамі, якія дазваляюць здымаць адзін за другім фарбавыя пласты і нават захоўваць іх. Такім чынам з аднаго абраза атрымліваюць два, тры і больш.

Але вернемся да абраза, прывезенага з Яраслаўля. Карыстаючыся новымі саставамі, рэстаўратары знялі ўсё, што зрабілі «багамазы»-рамеснікі. У свой час абраз быў названы «Сергій у жыціі». Аднак мастак, якому было даручана адлюстраваць жыццё настаяцеля лаўры — Сергія Раданежскага, ператварыў жыціе ў жывапіснае ўвасабленне «Сказу аб Мамаевым пабоішчы», які займае ў літаратуры амаль такое ж месца, як «Слова аб палку Ігаравым».

Цяпер, калі гэтая карціна раскрыта, на яе нельга глядзець без хвалявання. Нельга адарваць позірку ад залатаверхіх і беласнежных палацаў, храмаў і крамлёў Масквы, Яраслаўля, Ноўгарада, Уладзіміра, Суздаля.

«Сказ пра Сергія Раданежскага і Мамаева пабоішча», назавём так гэтую карціну, расказаў пра вонкавы выгляд крамлёў пералічаных гарадоў. Цудоўныя іх расчыненыя вароты, з якіх выходзяць воіны, закаваныя ў залатыя даспехі. Мастак выпісаў кожнае звяно кальчуг, і яны выглядаюць, як залатая луска. Уладзімірцы, суздальцы, яраслаўцы, ноўгарадцы пад камандаваннем сваіх князёў спяшаюцца на дапамогу да Маскоўскага князя Дзмітрыя Іванавіча Данскога. Кінавар, ляпіс-лазур, охра і іншыя фарбы — жывыя і чыстыя, быццам іх нанеслі толькі ўчора, — пераліваюцца на старажытнай дошцы. На пярэднім плане Дзмітрый Данской і Сергій Раданежскі. За імі мноства асілкаў з Перасветам і Аслябяй на чале. Бясконцы паток рускіх воінаў.

Галоўная тэма карціны — барацьба рускага народа з захопнікамі і занявольнікамі. Таленавітая шматпланавая кампазіцыя адлюстроўвае дух народа.

Ніжні фрыз карціны, на якім паказана Кулікоўская бітва, перамаганоснае вяртанне рускіх войск, уцёкі Мамая ў Кафу (цяперашняя Феадосія) і яго гібель ад рукі забойцаў, свецяцца золатам. Гэты ўчастак абраза, які мае вялікае гістарычнае значэнне, раскрывала таленавіты і вопытны рэстаўратар А. Рабініна.

Генрыета АЛАВА. (АДН).

АЛЬБОМ ДОБРЫХ СПРАЎ

Магілёўская абласная бібліятэка імя Ул. І. Леніна праводзіць эстафету пад назвай «Альбом добрых спраў».

Яе мэта — паспрыяць прапагандзе перадавога вопыту ў рабоце бібліятэк.

На старонках альбома будзе шырока паказана, як бібліятэкі прапагандуюць рашэнні XXIII з'езда КПСС, як рыхтуюцца сустрэць 50-годдзе Савецкай улады і 100-годдзе з дня нараджэння Ул. І. Леніна, як удзельнічаюць ва ўсесаюзным аглядзе бібліятэк. Апрача таго, альбом раскажа пра ўсё лепшае і карыснае, што дапамагае рабочым, калгаснікам, спецыялістам прамысловасці і сельскай гаспадаркі дамагацца поспехаў у працы.

У «Альбоме добрых спраў» будуць занатаваны найбольш цікавыя масавыя мерапрыемствы, якія праводзяцца ў бібліятэках, новыя формы і метады работы з чытачамі.

Альбом-эстафета пройдзе па пяці маршрутах.

Вынікі эстафеты будуць падведзены ў красавіку 1967 года.

Ул. САКАЛОЎСКІ.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

22 ліпеня

Першая праграма. 11.00 — панарама Радзімы (М). 11.45 — трансляцыя ваеннага параду і ўрачыстасцей, прысвечаных Дню адраджэння Польшчы. 16.55 — праграма перадач. 17.00 — для школьнікаў. «Лагер ля мора». Перадача з Адэсы. 17.30 — «Дзень адраджэння Польшчы». Міжнародная праграма (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны. 18.20 — «Музычныя тэатры свету». Неапалітанскі тэатр «Сан Карла» (М). 19.00 — А. Карняйчук. «Старонка дзённіка». Спектакль Кіеўскага ордэна Леніна акадэмічнага ўкраінскага драматычнага тэатра імя І. Франка. У перапынках — дзённік V Усесаюзных студэнцкіх гульняў. 21.50 — «Над Прыпяццю». Тураўскія замалёўкі. 21.10 — «На радзіме Адама Міцкевіча». Кінанарыс Беларускага тэлебачання. 22.30 — «Хрышчаныя агнём». Мастацкі фільм (Польшча).

Другая праграма. 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20 — наш кінаглобус. «Альманах кінападарожжаў». «Мая Віташа». Кінанарысы. 19.00 — «Майстры мастацтваў». Народны артыст СССР М. Мардвінаў (М). 20.40 — «Эстафета навін» (М). 21.30 — «Паэзія Лермантава ў музыцы». Перадача з Ленінграда. 22.10 — у эфіры — «Маладосць». Ён вучыўся ў Маскве» (М).

23 ліпеня

Першая праграма. 12.55 — праграма перадач. 13.00 — для школьнікаў. «Зялёны камень». Тэлевізійны спектакль (М). 15.05 — для малышоў. «Хто ў цераме жыве». Мультыплікацыйны фільм (М). 15.30 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Тэлезнайка» (М). 16.00 — рашэнні майскага Пленума КПСС — у жыццё. «Пошукі і знаходкі». Рэпартаж з эксперыментальнай гаспадаркі Навукова-даследчага інстытута меліярацыі. 16.30 — тэлевізійныя навіны. 16.50 — чэмпіянат свету па футболу (чвэрць фінала). Перадача з Англіі. 18.45 — дзённік V Усесаюзных студэнцкіх гульняў. 19.30 — тэлевізійныя навіны (М). 20.00 — эстрадны канцэрт (М). 20.45 — тэлевізійнае анкосатыры (М). 21.00 — творчы вечар Ленінградскага дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага драматычнага тэатра імя М. Горкага. Перадача з Ленінграда. 22.30 — Усесаюзны фестываль самадзейнага мастацтва. Заключны канцэрт конкурсу «Ад сяла да сяла». Перадача з Днепрапятроўска. 23.30 — чэмпіянат свету па футболу (у запісе) (М).

Другая праграма. 16.00 — «Народны музей «За ўладу Саветаў!» (М). 16.35 — тэлевізійныя навіны (М). 16.50 — для дзяцей. «Брат героя». Мастацкі фільм. 18.00 — «Праз многа год». Кароткаметражны фільм. 18.35 — «Вальс свабоды». Дакументальны фільм. 19.25 — «Танцы, трукі, мелодыі». Музычнае рэвю. 20.00 — «Адзін з сямі». Тэлевізійны спектакль.

24 ліпеня

Першая праграма. 9.55 — праграма перадач. 10.00 — на чэмпіянаце свету па футболу (у запісе) (М). 11.40 — у свеце мастацтваў. «Музей пад адкрытым небам». Перадача з Рыгі. 12.00 — «Здароўе». Навукова-папулярная праграма (М). 12.30 — Усесаюзны фестываль самадзейнага мастацтва. «Песні волжскіх берагоў». Спявае Ульянаўскі народны хор (М). 13.00 — «Белыя і чорныя». Тэлевізійны шахматна-шашачны клуб. 13.30 — інтэрв'ю ўдзельнікаў міжнароднага лёгкаатлетычнага матча СССР — Польская Народная Рэспубліка. 13.40 — «На заставе Завідава». Кінанарыс Беларускага тэлебачання. 15.00 — «Табе, юнацтва!» (М). 15.30 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «На варце марскіх рубяжоў» (М). 16.30 — тэлевізійныя навіны (М). 16.50 — «Музычны кіёск» (М). 17.15 — Усесаюзны дзень работнікаў гандлю (М). 17.45 — «Па вашых просьбах». Канцэрт (М). 18.30 — «Святло і цені». Міжнародная праграма (М). 19.00 — клуб кінападарожжаў (М). 20.00 — тэлевізійныя навіны (М). 20.30 — А. Жылінскі. «Хлопцы янтарнага берагу». Спектакль Свярдлоўскага тэатра музычнай камедыі (М). 23.45 — дзённік V Усесаюзных студэнцкіх гульняў.

Другая праграма. 17.15 — «Шлях да адкрыцця». Кінанарыс. 17.30 — «Добры дзень, сябры». Дакументальны фільм. 18.00 — V Усесаюзныя студэнцкія гульні. Вольная барацьба (фінал). 20.00 — «Тут будзе горад...» Навукова-папулярны фільм. 20.20 — «Чырвонае чарніла». Мастацкі фільм. 21.50 — канцэрт Дзяржаўнага ансамбля танца Асецці.

У СВЕЦЕ ДЗІЦЯЧАЙ ФАНТАЗІІ

ГОД назад пры Палацы культуры Мінскага камвольнага камбіната была створана дзіцячая студыя выяўленчага мастацтва. Часу прайшло яшчэ мала, але ўжо можна смела гаварыць пра поспехі юных мастакоў.

Зазірнём у студыю выяўленчага мастацтва. На сценах, сталах — работы дзяцей. Малюнкі, скульптуркі з пластыліну, гіпсу, гліны... Вочы разбягаюцца. Здаецца, трапляеш у цудоўны свет дзіцячай фантазіі. Работы вабяць сваёй шчырасцю, непасрэднасцю.

За гэты год дзеці падрыхтавалі пяць выставак. На іх былі работы, выкананыя акварэллю, туашам, тушшу. Вельмі цікавыя і свежыя аплікацыі. Своеасаблівыя таксама вітражы.

На гарадской выстаўцы школьнага малюнка экспанавалася дванаццаць работ нашых юных мастакоў. Дзевяць з іх узнагароджаны дыпломамі.

Закончылася рэспубліканская выстаўка, на якой студыя выяўленчага мастацтва Палаца культуры экспанавала 73 работы.

Хочацца сказаць некалькі слоў пра юных мастакоў дзіцячай студыі.

...Вялікі серабрысты самалёт раскінуў крылы. Полымя. Лётчык, які ляжыць у кабіне. Хмары. Гэта кампазіцыя дзесяцігадовага Сяргея Клішэвіча «Лётчык-герой». Сяргей паказвае вайну ў трох колерах. Светлы нібы ўвасабляе светлае заўтра і веру ў перамогу. Чырвоны і чорны — водбліскі жудасных дзён вайны.

«Бітва з палаўцамі» — так назваў сваю работу дзевяцігадовы Жэня Курбан. Ён выкарыстаў матывы «Слова аб палку Ігаравым». Малюнак захапляе сваёй шчырасцю.

Дынамічная кампазіцыя са своеасаблівым вырашэннем адзінаццацігадовага Толі Сушкевіча «Красная плошча». Лірычным настроем павявае ад малюнка адзінаццацігадовага Вадзіма Лабанава «Вясна».

Лёня Ажар і Лёня Даліннік любяць тэмы сённяшняга дня. Малюнак першага з іх — «На новай планеце». З дзіцячай шчырасцю паказана невядомая планета, на якую прызямліўся савецкі чалавек.

«Марскі бой» — адна з работ дзевяцігадовага Ігара Харунжага. Малюнкі Ігара вызначаюцца ўдумлівасцю і закончанасцю.

Хочацца адзначыць і цікавыя графічныя лісты «Варатар» Федзі Хмялёва, «Шляхі-дарогі» Сашы Бранцава, «Лёдавае пабоішча» Косці Уланава, «Жырафы» Сашы Бароўскага.

У тым, што ў Палацы культуры дзеці вучацца бачыць і ствараць цудоўнае, вялікая заслуга кіраўніка гуртка Васіля Фёдаравіча Сумарава. Ён добра разумее дзяцей, ведае іх запатрабаванні, умее зацікавіць. І, нягледзячы на тое, што ў Васіля Фёдаравіча тры розныя ўзроставыя групы, ад шасці да васемнаццаці гадоў, з кожным вучнем ён знаходзіць агульную мову. Калі б ні зайшоў у студыю, тут заўсёды цікавая, сапраўды творчая абстаноўка.

Вельмі часта Васіль Фёдаравіч робіць паходы з дзецьмі ў лес, на возера, поле, дзе яны малююць, збіраюць мудрагелістыя карэнні, якія потым нібы ажываюць пад рукамі юных мастакоў.

Г. КУШАЛЕВІЧ,
загадчык метадычнага кабінета Палаца культуры Мінскага камвольнага камбіната.

Людвік ГУРСКІ

ЗНАЁМСТВА

Наша знаёмства працягвалася нядоўга. Дакладна — пяць гадзін і васемнаццаць мінут. Мы сутыкнуліся... плечукамі ў вагоне поезда, куды мяне ўнёс на локцях шумлівы натоўп пасажыраў, якія прагнулі адпачынку. Нас прыціснулі адно да аднаго, асудзіўшы на нерухомасць на ўвесь час падарожжа.

— Прабачце, — пачуў я за сабою голас з мецца-сапранавымі пералівамі.

— Гэта я павінен прасіць прабачэння, — адказаў я, імгненна сарыентаваўшыся, што знайшоў апору ў жанчыне.— Што зробіш, усе хочуць ехаць.

Так мы пазнаёміліся.

Спачатку мы абменьваліся банальнымі заўвагамі наконт работы транспарту і становішча звычайнага пасажыра, які едзе на адпачынак. Ад транспарту мы перайшлі да падарожжаў наогул, і мая знаёмая выявіла вялікія веды ў галіне геаграфіі. Потым мы гаварылі аб астранаўтыцы, антыбіётыках і літаратуры. Апошняя тэма вельмі нас захапіла, і аказалася, што мы шмат у чым згодны ў ацэнках сучаснай творчасці — як айчыннай, так і зарубежнай.

Праз некаторы час я ўсвядоміў, што не назваў сябе. Але як гэта зрабіць, стоячы плячыма да жанчыны,— ні руку пацiснуць, ні пакланіцца, ні нават у вочы зазірнуць? А мне было вельмі цікава, як яна выглядае. Я толькі зразумеў, што яна трошкі ніжэйшая за мяне, бо калі цягнік прытармажваў, яе патыліца ўпіралася ў маю шыю.

Па яе манеры гаварыць я мог меркаваць, што жанчына яна спакойная, лагодная, і нават паспрабаваў уявіць, як яна ўсміхаецца. Усмешка, напэўна, мілая, а позірк цёплы.

Ад агульнай тэматыкі мы перайшлі да пытанняў больш асабістых. Яна паведаміла, што працуе фармацэўтам і едзе на мора купацца, бо надта любіць мора. Я, у сваю чаргу, праінфармаваў, што надзвычай люблю доўгія прагулкі па ціхіх прыморскіх пляжах. Яна таксама любіла іх. А вось яе муж, з якім яна нядаўна развялася, не любіў мора.

Я зрабіў адчайны паварот галавы, каб ацаніць вартасць магчымых прагулак па ціхіх прыморскіх пляжах, але ўбачыў толькі фрагмент пляча. Гэтага было замала.

— Можа хто сыдзе на наступнай станцыі, — шапнула мая знаёмая, — тады можна будзе павярнуцца.

— Можа, — уздыхнуў я. На жаль, усе захапляліся купаннем у моры і ехалі да канца.

Я хацеў быў папрасіць прыціснутую да нашых плячэй тоўстую пасажырку, каб яна апісала маю знаёмую, але тут жа адмовіўся ад гэтай ідэі. Меркаванні жанчыны аб іншых жанчынах пераважна зласлівыя, а, значыць, неаўтарытэтныя.

Мы абмяняліся яшчэ некаторымі звесткамі пра сябе і дайшлі да таго стану інтымнасці, калі неабходна карыстацца позіркамі, усмешкай, а можа нават і дотыкам рук.

Пад канец паездкі мы маўчалі. Гэта было маўчанне, з якога ясна вынікала, што ў больш спрыяльных умовах мы маглі б сказаць адно другому вельмі многа.

— Яшчэ пятнаццаць мінут,— сказаў я, і ў маім голасе была нецярплівасць, спалучаная з надзеяй.

Яна, вядома, адчула гэта, бо адразу ж паправіла мяне:

— Толькі восем мінут, мы праехалі станцыю з вакзальным гадзіннікам.

Яна вымавіла гэтыя словы голасам жанчыны, якая чакае каханага. Так я зразумеў яе прыцішаны шэпат.

Нарэшце, цягнік запаволіў ход і спыніўся.

Натоўп захваляваўся і расштурхаў нас у розныя бакі. Не паспеў я азірнуцца, як ужо быў выпхнуты з вагона. Толькі на пероне я пачаў роспачліва паглядаць навокал.

Я ўбачыў яе. Яна чакала. Я падбег.

— Прабачце, — вымавіў я, — гэта я... з вамі... памятаеце... у вагоне...

— Вы пра што? — буркнула яна. — Я вас не ведаю.

— Мы гутарылі пра астранаўтыку і антыбіётыкі.

— Я першы раз вас бачу...

— Я ведаю, што першы раз, бо...— заікаўся я... — бо мы спіной...

— Прашу пакінуць мяне ў спакоі, — адрэзала незнаёмая.

На пероне было мноства людзей. Я зазіраў у твар кожнай жанчыне. Я падыходзіў бліжэй, каб праверыць, чыя галава на ўзроўні маёй шыі. Я спрабаваў некалькі разоў загаварыць з жанчынамі, якія прыглядаліся да мяне, але ніводная з іх не была маёй знаёмай.

А мы ж былі так блізка, блізка...

Пераклаў з польскай мовы А. МАЖЭЙКА.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, Э. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, карэспандэнцкага пункта ў Гомелі — 2-70-83, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-97-44.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Моделист-конструктор



Энтузіястам тэхнікі, цікаўным і дапытлівым, прысвячаецца штомесячны часопіс «Моделист-конструктор». Канструктарам «малой авіяцыі» часопіс паможа пабудаваць лятаючыя мадэлі — ад самых простых да лепшых узораў сусветнага спартыўнага класа.

Будучых пакарыцеляў водных прастораў часопіс пазнаёміць з навінкамі малога суднабудавання, дасць чарцяжы і разлікі яхт, катамаранаў, глісераў, кацераў.

Прыхільнікі аўта- і мотатэхнікі знойдуць на старонках часопіса падрабязныя матэрыялы аб аматарскіх канструкцыях спартыўных мадэлей і мікрааўтамабіляў, картаў і мотаролераў, усюдыходаў-амфібій і аэрасаней.

«Моделист-конструктор» пазнаёміць чытачоў з асноўнымі вядучымі галінамі тэхнікі нашых дзён — радыёэлектронікай, аўтаматыкай, тэлемеханікай, кібернетыкай.

Вялікае месца ў часопісе адводзіцца айчыннай і зарубежнай хроніцы.

«Моделист-конструктор» — верны сябра і добры дарадчык ва ўсіх захапляльных справах, імя якім — тэхнічная творчасць.

Цана аднаго нумара — 25 капеек.

Цэнтральнае рознічнае агенцтва «Саюздрук».

Друкарня выдавецтва «Звязда». Індэкс 63856. АТ 02555